№ 5(45)/2002

# Беларускія Ведамасьці

ВАРШАВА, жнівень-верасень 2002 г.

# ТРЭБА АДБУДАВАЦЬ ХРАМ



Фота У. Багданава

## ХРОНІКА ПАРУШЭНЬНЯЎ ПРАВОЎ БЕЛАРУСАЎ

***ЛІСТАПАД*** (2001 год, працяг з №4(44)

*Лістапад.* Выкладчыкам творчага аб’яднаньня Беларускіх гуманітарных ліцэйскіх клясаў Сьветлагорска (Гомельшчына) не выплочваюцца заробкі. На працягу трох тыдняў выкладчыкі і навучэнцы філіяла Нацыянальнага дзяржаўнага гуманітарнага ліцэя імя Якуба Коласа адстойвалі права захаваць свой калектыў. Ліцэісты ў вольны ад заняткаў час неаднаразова праводзілі пікеты перад будынкамі мясцовай улады.

*Лістапад.* У ізалятары часовага ўтрыманьня Аддзелу міліцыі Менскага раёну (як паведамілі часова арыштаваныя) — антычалавечыя ўмовы. Зрэшты, як і ўсюды ў Беларусі.

У камэры, разьлічанай на **8** арыштантаў, трымаюць **12**. Сьпяць на падлозе. Памяшканьне кішыць клапамі. Перадачаў не дазваляюць. Рацыён складаецца з гарбаты і кавалка хлеба нараніцы і ўвечары, днём — поліўка. Адносіны — зьняважлівыя.

*Лістапад.* Дэлегаты XIV-га зьезду Беларускага грамадзка-культурнага таварыства ў Польшчы, што адбыўся ў лістападзе ў Беластоку, выказалі трывогу аб стане беларускага школьніцтва ў Польшчы. Цяпер на Падляшшы, дзе пераважна жывуць беларусы, родную мову вывучаюць толькі 3,5 тысячы вучняў у гімназіях і ліцэях, якія раней былі цалкам беларускамоўнымі. Аднак і па наш бок мяжы, на Горадзеншчыне, стан беларускага школьніцтва ня лепшы, а нават горшы. Толькі 2613 вучняў займаюцца ў беларускамоўных клясах горадзенскіх школ. Сёлета ў Горадні няма падрыхтоўчых, першых і другіх беларускамоўных клясаў. Па абодва бакі мяжы праводзяць дэбеларусізацыю беларускага насельніцтва.

*Лістапад.* Згодна інфармацыі Міністэрства статыстыкі і аналізу,

зарплата на Беларусі зьменшылася за лістапад на 0,6% (са 151210 да 150247 руб.).За гэты ж час спажывецкія кошты вырасьлі на 4,6%, а рынкавы наяўны курс даляра — на 3,2%.

У валютным эквіваленце зарплата зьнізілася з 99,81 да 96,08 даляра, альбо на 3,7%. Ніжэйшай зарплата была толькі ў чэрвені (92,65 даляра). У верасьні яна была роўная 98,82 даляра. Ад пачатку года спажывецкія кошты ўзрасьлі на 42,4%.

## *СЬНЕЖАНЬ* (2001 год)

*3 сьнежня* ў Вярхоўным судзе Беларусі абвешчана рашэньне па іску Міністэрства юстыцыі да грамадзкай арганізацыі „Задзіночаньне беларускіх студэнтаў”. Суд прызнаў правамоцнымі чатыры з пяці папярэджаньняў, вынесеных у адрас ЗБС Мін’юстам і прыняў рашэньне аб ліквідацыі ЗБС. Кіраўнік ліквідаванай арганізацыі ***Крысьціна Сідун*** лічыць, што „такім чынам выконваюцца ўказаньні Лукашэнкі, які помсьціць студэнтам і рэктарам за тое, што студэнцтва на прэзыдэнцкіх выбарах галасавала ў асноўным супраць яго... З ВНУ выключаюць найбольш актыўных студэнтаў — сяброў нашай арганізацыі; некаторых высяляюць з інтэрнатаў, здымаюць рэктараў, узмацняюць жорсткасьць унутранага распарадку. Аднак адмена рэгістрацыі ня можа спыніць дзейнасьці арганізацыі”, — паведаміла К. Сідун і дадала, што неўзабаве адбудзецца ўстаноўчы сход новай студэнцкай арганізацыі і будуць пададзены дакументы ў Мін’юст на яе рэгістрацыю.

*3 сьнежня, Менск.* Маладафронтавец ***Раман Казакевіч*** аштрафаваны судом Савецкага раёну на 100 тысячаў рублёў за абарону Курапатаў.

*3 сьнежня* былыя кіраўнікі Гомельскага Дзяржаўнага медінстытуту прафэсар ***Юры Бандажэўскі*** і дацэнт ***Уладзімер Раўкоў*** (раней асуджаныя Ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда Беларусі да 8 гадоў пазбаўленьня волі) падалі скаргі ў Камітэт па правах чалавека, Бюро вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека (Жэнэва) і ў Міжнародны суд па правах чалавека (Страсбург). У скаргах паведамлена пра істотныя парушэньні крымінальна-працэсуальнага заканадаўства, якія перашкодзілі поўна і аб’ектыўна дасьледваць абставіны справы. Адвакат *Дзьмітры Іванішка* зазначыў, што яго падабаронны *Уладзімер Раўкоў* быў гвалтам змушаны да дачы паказаньняў.

*4 сьнежня, Менск.* За абарону Курапатаў суддзя **Казадаеў** пакараў спадара ***Сяргея Папкова*** штрафам у 50 тысячаў рублёў.

*5 сьнежня.* У Менску быў затрыманы і зьмешчаны ў ізалятар часовага ўтрыманьня ГУУС Менгарвыканкаму малады рэжысёр-пастаноўшчык ***Руслан Зголіч***. Яго абвінавацілі ў выкраданьні стужкі зь незавершанай вэрсіяй фільму „Госьці”, рэжысёрам якога ён зьяўляецца.

*5 сьнежня.* Міністэрства юстыцыі Беларусі ў сваім лісьце, фактычна, пацьвердзіла, што Аляксандар Лукашэнка адкрыта парушае Канстытуцыю краіны. „Указ Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь ад 12-га студзеня 1998 году №19 у афіцыйных крыніцах прававой інфармацыі не друкаваўся, паколькі зьяўляецца нарматыўным актам, які мае грыф абмежаванасьці ў доступе”, — піша намесьнік Міністра **В**.**Міцкевіч**.

Між тым у артыкуле **7** Канстытуцыі Беларусі сказана: „Нарматыўныя акты дзяржаўных органаў друкуюцца і даводзяцца да ўсеагульнага азнаямленьня іншым прадугледжаным законам спосабам”.

У сакрэтным указе А. Лукашэнкі ад 12 студзеня 1998 г. №19 (па зьвестках крыніцаў з прэзыдэнцкай адміністрацыі) можа ўтрымлівацца загад стварыць спэцыяльную брыгаду, якую неафіцыйна называюць *„эскадрон сьмерці”.*

*6 сьнежня* ўзбуджана крымінальная справа па факце вандалізму на месцы масавых расстрэлаў ахвяраў сталінскіх рэпрэсіяў у Курапатах: разбурэньня ўстаноўленай падчас візыту ў Беларусь прэзыдэнта ЗША Біла Клінтана мэмарыяльнай лавачкі. Следчыя дзеяньні пачаліся амаль праз 3 месяцы пасьля разбурэньня памятнага знаку.

*9 сьнежня.* У гарадах Беларусі адбыліся акцыі (ў межах кампаніі „Хочам ведаць праўду”), прымеркаваныя да гадавіны прыняцьця Ўсеагульнай дэкларацыі правоў чалавека. *У Горадні* мерапрыемства доўжылася каля 40 хвілінаў; у ім узяло ўдзел 30 чалавек. *У Берасьці* удзел у пікеце ўзялі каля 30 чалавек. Праз 40 хвілінаў намесьнік начальніка Ленінскага РАУС **Крэгель** даў каманду арыштоўваць. Людзі супраціўляліся, сядалі на зямлю. 12 чалавек дастаўленыя ў пастарунак: **Э. Карпюк**, **М. Клімовіч**, **М. Мікалюк**, **С. Казлоў**, **М. Казімірчык**, **В. Барбулін**, **В. Малей**, **В. Вялічкін**, **Р. Антанюк**, **П. Панасюк**, **Г. Самойленка**, **сп. Алексіевіч**. На ўсіх складзеныя пратаколы.

*13 сьнежня.* У судзе Чыгуначнага раёну Гомеля працягвалася слуханьне справы аб парушэньні старшынёй гарадзкога моладзевага цэнтру *„Гарт”* ***Сяргеем Адзінцовым*** дэкрэту Лукашэнкі №8 „Аб некаторых мерах па ўдасканаленьні парадку атрыманьня і выкарыстаньня замежнай бязвыплатнай дапамогі”. (10 жніўня ўпраўленьнем КДБ па Гомельскай вобласьці ў арганізацыі была канфіскаваная аргтэхніка коштам прыкладна ў 4 тысячы даляраў ЗША ў парадку крымінальнай справы аб графіці. Пазьней крымінальная справа была спыненая, але тэхніку „Гарту” не вярнулі.) Падатковая інспэкцыя раёну (зыходзячы з дадзеных КДБ) сцьвярджае, што тэхніка выкарыстоўвалася не па прызначэньні, а для правядзеньня незалежнага назіраньня за ходам прэзыдэнцкіх выбараў (чым і быў, маўляў, парушаны дэкрэт).У такім выпадку аргтэхніка будзе падлягаць канфіскацыі.

*13 сьнежня.* Штрафам у памеры 50 мінімальных заробкаў пакараны галоўны рэдактар забароненай горадзенскай газэты *„Пагоня”* ***Мікола Маркевіч*** (суддзя горадзенскага Ленінскага раённага суда **Дзьмітры Дземчанка**). Журналіста абвінавацілі ва ўдзеле ў несанкцыянаваным пікетаваньні 19 лістапада ў Горадні, калі грамадзяне пратэставалі супраць рэпрэсіяў у дачыненьні да *„Пагоні”.*

*17 сьнежня. Менск.* Адсутнасьць сродкаў вымусіла камэрцыйную фірму *Сотвар* перапыніць вытворчасьць аўдыё і відыё касэтаў па-беларуску. Гэта быў адзіны ў краіне праект у справе выпуску беларускамоўнай відэапрадукцыі для дзяцей, які праіснаваў толькі 2 гады.

*17 сьнежня.* Берасьцейскія жыхары пратэстуюць супраць пабудовы магільніка радыяцыйных адходаў побач з горадам.

Акупацыйныя ўлады вырашылі пабудаваць магільнік для радыёактыўных адходаў каля вёскі Струга, што на мяжы Берасьцейскага і Маларыцкага раёнаў. Жыхары Стругі і іншых навакольных вёсак аб прынятым уладамі рашэньні даведаліся пасьля таго, як пачаліся будаўнічыя работы. Рэакцыя вяскоўцаў была рэзка адмоўнай. Амаль паўтысячы чалавек падпісаліся пад зваротам у дзяржаўныя ўстановы з патрабаваньнем правесьці поўнавартасную экалягічную экспэртызу будаўніцтва магільніка. Вяскоўцы гавораць пра магчымасьць масавых акцыяў у абарону свайго навакольля, а таксама супраць уладаў.

*20 сьнежня,* у афіцыйны „дзень супрацоўнікаў дзяржбясьпекі” у Гомлі адбылася трагедыя. 24-гадовы ***Андрэй Зайцаў*** скончыў жыцьцё самагубствам. (Пасьля таго, як Андрэй уступіў у маладзёвую арганізацыю „Зубр”, КГБ пачаў яго вярбаваць. Радыё „Свабода” перадавала запісы размоваў нябожчыка з кагэбістым, які называўся старэйшым лейтэнантам **А.В. Яўсьціеневым** і пагражаў юнаку, патрабуючы ад яго працаваць на КГБ. У рэпартажы з пахаваньня юнака гучалі выступы зуброўскіх кіраўнікоў: „істінно русскіе” прамовы, зусім невядомыя нікому прозьвішчы („Зубр” крэатура КГБ).

Адкуль зьявіліся гэтыя новыя „камсамольцы”, якія зьбіраюць вакол сябе пад чорным сьцягам беларускую патрыятычную моладзь, каб адразу яе завербаваць, альбо паставіць пад удар спэцслужбаў, — зразумела.

*26 сьнежня.* Суд Менскага раёну прысудзіў ***Юры Фабішчэўскаму*** штраф у 20 мінімальных заробкаў (200 тысячаў рублёў) за ўдзел у абароне Курапатаў ад варварскага зьнішчэньня 8-га лістапада (тады ён быў затрыманы „амонам” і зьбіты).

*Сьнежань.* Дасьледваньні ў межах сумеснага беларуска-украінска-амэрыканскага праекту паказалі, што рак шчытападобнай залозы сярод пацярпелых ад радыяцыі беларусаў сустракаецца ў **5** чалавек на тысячу.

*Сьнежань.* Рэчыцкая міжраённая паркуратура яшчэ на два месяцы падоўжыла тэрмін папярэдняга сьледзтва па крымінальнай справе аб зьнявазе і паклёпе на адрас „прэзыдэнта” Беларусі з боку мясцовай

жыхаркі ***Натальлі Брэль***. (30 жніўня асьпірантка Інстытута гісторыі Нацыянальнай Акадэміі Навук Беларусі *Натальля Брэль* павіншавала Лукашэнку з днём нараджэньня, перадаўшы яму праз прадстаўнікоў мясцовых уладаў скрынку з прадметамі, якія (на яе думку) становяцца для беларусаў неабходнымі: вяроўку і мыла. Па дадзеным факце пракуратура ўзбудзіла крымінальную справу, абвінаваціўшы Н. Брэль у паклёпе і зьнявазе кіраўніка дзяржавы. З моманту ўзбуджэньня крымінальнай справы прайшло тры месяцы, а сьледства ня можа адважыцца назваць пацярпелага па справе. З гэтай нагоды тэрмін сьледства падоўжаны да канца студзеня 2002 г.

*27 сьнежня „Народная Воля"* надрукавала „ўнікум" — *„Пастырскі ліст на Божае нараджэньне 2001 года Гасподняга",* напісаны кардыналам **Казімірам Сьвёнткам**. Разважаючы пра ўрачыстасьць Божага нараджэньня, яго эксэленцыя напісаў вялікі ліст да беларускіх вернікаў, ні разу не ўспомніўшы слова „Беларусь" і „беларусы".

Гэта, з аднаго боку, мастацтва, а з другога — добрая ілюстрацыя да таго, чаму народ, які сябе паважае і хоча, каб яго паважалі, мусіць мець *свой беларускі касьцёл* і *сваю беларускую царкву*, сваіх сьвятароў, кардыналаў, мітрапалітаў ды біскупаў.

*Сьнежань.* Жыхаркі Бабруйска ***Люба Станкевіч***, ***Ева Усьцімчук***, ***Яніна Аўсянік***, ***Галіна Гусева*** патрабавалі сустрэчы з Лукашэнкам перад ягонай сталічнай адміністрацыяй. Не пасьпелі яны разгарнуць плякат з напісанай на ім просьбай аб сустрэчы, як іх схапіла міліцыя і павезла ў Ленінскі РУУС, дзе на іх склалі пратаколы аб адміністрацыйным правапарушэньні. У гэты ж дзень іх судзілі ў судзе Ленінскага раёну Менска на працягу 20 хвілінаў. Іхнага юрыдычнага прадстаўніка ў залю не дапусьцілі.

Суддзя вынес пастанову аб адміністрацыйным арышце *Е. Усьцімчук* (маці непаўнагадовага дзіцяці) і *Л. Станкевіч* на 10 сутак. (Л. Станкевіч адразу абвесьціла галадоўку пратэсту.) *Г. Гусевай* і *Я. Аўсянік* прысудзілі штраф па 150 „мінімалак" (каля 1500 даляраў ЗША — сярэдні заробак за два гады).

*Сьнежань. Менск.* Міжнародны дзень інваліда група інвалідаў-калясачнікаў сустрэла каля ўваходу ў прыёмную адміністрацыі „прэзыдэнта". Яны спрабавалі ўручыць чыноўнікам свой зварот. Выйсьці да іх ніхто з чыноўнікаў не схацеў. Тады яны паехалі на калясках да „прэзыдэнцкага" палаца (на К. Маркса, 38), дзе іх спыніла мужная ахова зь міліцыі і „амонаў", пагрозьліва патрабуючы пакінуць гэтае месца. Ахоўнікаў аказалася мала, пад'ехала падмога на машыне. Але пэтыцыю ўсё ж прынялі.

*Сьнежань.* На Берасьцейшчыне са студзеня 2002 г. усе базавыя школы пераходзяць на пяцідзёнку. Такі экспэрымэнт зроблены, каб „разгрузіць" дзяцей, а таксама з мэтай эканоміі грошай. Заняткі, што праходзілі ў суботу, проста перанесеныя на іншыя дні.

*Сьнежань.* На канец году на Магілёўшчыне засталася непагашанай запазычанасьць па зарплаце за лістапад — 9,9 млрд. руб, за верасень - кастрычнік — 2,26 млрд. рублёў.

Згодна інфармацыі абласнога ўпраўленьня статыстыкі, жыхары Магілёўшчыны 69,9% сямейнага бюджэту аддаюць на набыцьцё прадуктаў.

*Сьнежань.* Міністэрства эканомікі загадала напалову зьменшыць бюджэтныя выдаткі на будаўніцтва школаў, шпіталёў і дамоў культуры.

*Сьнежань.* Каля 300 рабочых Магілёўскага машынабудаўнічага заводу апынуліся бяз працы пасьля таго, як адміністрацыя заявіла пра банкруцтва прадпрыемства.

Заяву з просьбай прызнаць завод банкрутам накіравалі ў абласны гаспадарчы суд. Кіраўнікі прадпрыемства абгрунтоўваюць сваё рашэньне адсутнасьцю фінансаваньня і крэдыторскай запазычанасьцю 500 мільёнаў рублёў.

Найбольш пацярпелі з-за гэтага кроку пацоўныя. Да гэтага часу ім ня выплацілі грошай нават за жнівень. І такія затрымкі суправаджалі іх увесь год.

***Інфармацыйная Камісія Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ; Прэс-служба БНФ; Рэдакцыя „Б.В."*** *Па матэрыялах Камісіі,СМІ, радыё, друку („Народная Воля", „Наша свабода", „Пагоня", „Ніва", „Права на Волю" і інш.)*

# СТВАРЭНЬНЕ БКА

У канцы жніўня, пасьля арганізацыі Менскага гарадзкога Камітэта па Абароне Бацькаўшчыны і пасьля стварэньня першых мясцовых Камітэтаў па Абароне, прадстаўнікі КА і прадстаўнікі беларусаў замежжа прынялі рашэньне аб утварэньні Агульнага Беларускага Камітэту па Абароне Бацькаўшчыны ад расейскай агрэсіі (скарочана — Беларускі Камітэт Абароны, БКА). Беларускі Камітэт Абароны і ягонае кіраўніцтва часткова знаходзяцца за мяжой. У пачатку верасьня пачалася дзейнасьць. БКА кіруецца Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь.

У жніўні-верасьні ўтварылася каля дзясятка новых Камітэтаў Абароны. Бальшыня зь іх выпускае бюлетэні. Напрыклад, „За незалежную Беларусь", „Грунвальд", „Наша сталіца", „Абаронім Беларусь", „Жыве Беларусь!" (Менск і Менскі раён); „Час Пагоні" (Пінск) і інш. Запачаткаваны таксама бюлетэнь БКА „Вольная Беларусь".

* * *

Камітэты па Абароне ствараюцца паўсюдна: па месцы працы, жыхарства, вучобы, дзяржаўнай і вайсковай службы. Колькасьць сяброў — ад трох да сямі асобаў. Калі зьяўляецца больш асобаў, ствараецца іншы Камітэт. Камітэты дзейнічаюць аўтаномна. Сьпісы ўдзельнікаў не складаюцца, удзел не фіксуецца. Каардынацыя вызначаецца вуснымі інструкцыямі і на падставе лістоў БКА.

Дзейнасьць Камітэтаў па Абароне разьвіваецца паэтапна, спэцыяльныя задачы вызначаюцца вусна. Пагрозы асобам з боку КА не дапускаюцца.

Задачы першага этапу заключаюцца ў наступным:

— адсочваньне дзеяньняў і кантроль за антыканстытуцыйнай дзейнасьцю чыноўнікаў, кіраўнікоў прадпрыемстваў, навучальных установаў, камандзіраў вайсковых фармаваньняў, сродкаў масавай інфармацыі;

— папярэджваньне аб крымінальнай адказнасьці асобаў, якія праводзяць яўную або ўскосную антыканстытуцыйную дзейнасьць, накіраваную на ліквідацыю незалежнасьці і суверэнітэту Беларусі, на асіміляцыю маладога беларускага пакаленьня, на зьнявагу нацыянальнага гонару і годнасьці беларусаў, на дыскрымінацыю беларускіх нацыянальных каштоўнасьцяў;

— інфармаваньне грамадзянаў пра сутнасьць і небясьпеку для беларусаў хлусьлівай прапаганды пра „шчасьлівую будучыню" у так званай „саюзнай дзяржаве" пад крамлёўскім кіраўніцтвам;

— інфармаваньне беларускага грамадзтва пра неабходнасьць ігнараваньня любых выбараў і рэфэрэндумаў, арганізаваных рэжымам;

— інфармаваньне грамадзянаў, якіх рэжым уцягвае ў свае нібыта „выбарчыя" арганізацыі і „выбарчыя" мерапрыемствы, пра адказнасьць перад дзяржавай Рэспублікай Беларусь і беларускім народам за супрацоўніцтва з акупацыйным рэжымам на карысьць іншаземнай дзяржавы (Расеі);

— інфармаваньне беларускага грамадзтва пра неабходнасьць правядзеньня новых выбараў прэзыдэнта Беларусі пад міжнародным пратэктаратам (без удзелу Расеі як агрэсіўнай краіны);

— інфармаваньне грамадзянаў пра неабходнасьць стварэньня па месцы жыхарства і на прадпрыемствах ***Камітэтаў самакіраваньня***, грамадзкіх органаў ***аховы парадку*** і ***самаабароны***. Спрыяньне і дапамога ў іхнай арганізацыі.

* * *

Мясцовыя Камітэты Абароны мусяць адразу наладзіць выпуск і распаўсюджваньне інфармацыйных бюлетэняў МКА і электронную перадачу інфармацыі.

* * *

У першым нумары бюлетэня БКА, акрамя інфармацыі пра стварэньне БКА, надрукаваныя матэрыялы „Аб канкрэтных дзеяньнях. Першы чын", „Заўвагі па аспэктах", дзе пададзены ўказаньні БКА, аналіз сітуацыі і зьмест і патрэбы першага этапу дзейнасьці БКА.

Пададзена таксама іншая інфармацыя.

Зьместы першых мясцовых бюлетэняў КА радуюць сваёй зьмястоўнасьцю, добрай чытальнасьцю і ўзроўнем. У будучыні ў *„БВ"* будзе зроблены агляд некаторых даступных нам бюлетэняў Камітэту Абароны.

***ЗП.***

# А ДЗЕ Ж ТЫЯ ВАЯРЫ?

Гэта самы чалавечны і ў той жа час самы рамантычны партрэт будучага імпэратара – „Напалеён на Аркольскім мосьце" (мастак Антуан-Жан Гро). Партрэт-акцыя, дзе адлюстраваны подзьвіг маладога генэрала. Памятаю, як угледаючыся ў мужны твар на эрмітажнай выставе, я,— тады зусім малады чалавек,— усхвалявана думаў: „Вось яна – рэвалюцыя! Такія асобы абуджаюць свой народ і абнаўляюць Эўропу..."

Фон карціны, як заўсёды ў жывапісе рамантызму, гучаў сімфоніяй пачуцьцяў, быў адлюстраваньнем перажываньняў героя. Здавалася, хмары зьліліся ў субоі з гарамі, і няма межаў тытанічным стыхіям. Можна сабе ўявіць, што сучасьнікі напалеёнаўскіх войнаў перажывалі яшчэ мацнейшы катарсіс у дыялёгу з гэтым палатном.

У лістападзе 1796 г. рэвалюцыйная армія на шляху да Вэроны сутыкнулася з непераадольным супраціўам фэадальнага войска. Аўстрыйцы адбівалі атаку за атакай, у французкіх шыхтах запанаваў адчай і сум. Як раптам на перадавой зьявіўся галоўнакамандуючы, схапіў палкавы сьцяг і пабег па мосьце, заваленым трупамі. Усе кінуліся за ім, аўстрыйскія шыхты пачалі разьбягацца... Нядаўна я быў на гэтым мосьце ў італьянскім мястэчку Арколі, якое знаходзіцца на самым роўным месцы Падуанскай даліны. Даўняе юнацкае перажываньне, прадыктаванае мастацкім творам, карэктавалася рэчаіснасьцю. Ніякіх гораў, ніякай бездані пад мостам. Масток у 60-65 крокаў над банальна простым арашальным каналам. Ды й сам эпізод, тая колішняя крыніца катарсісу пры дакумэнтальным вывучэньні сюжэта набылі зусім празаічныя рысы. Аказалася, усе, хто пабег побач з Банапартам, былі забітыя. А тыя, хто імпэтна бег сьледам, саштурхнулі яго разам са сьцягам у мутную ваду канала (што й ўратавала яму жыцьцё). Захапляльны вобраз трыюмфальнага шэсьця Рэвалюцыі быў вернуты на зямлю, дзе 200 гадоў таму ня было месца прыгажосьці, а адбывалася крывавае сутыкненьне паміж дзьвюма вялікімі групамі людзей.

Ці падмануў мастак Гро сваіх сучасьнікаў, ці пакінуў для будучыні карціну, што не адпавядала рэчаіснасьці? Не! Твор жывапісу – гэта не штабная рэляцыя і не сухая справаздача назіральніка. Мастак – стваральнік ідэала, вобраза эпохі. Ягоны пэндзаль выводзіў радкі легенды нацыянальнай гісторыі, якая натхняла (і працягвае натхняць цяпер) сэрцы французаў. У гэтым ёсьць чароўная сіла сапраўднага мастацтва.

У гістарычных аналах народаў часам захоўваюцца аб'ектыўна зусім малазначныя падзеі. Аднак, яны ўзвышаюцца ў нацыянальнай самасьвядомасьці велічнымі манумэнтамі, яны – апірышчы духоўнай традыцыі. Атаку пры Самасьеры вывучаюць у польскіх вайсковых акадэміях, палякі едуць у Гішпанію, каб пакланіцца мясьцінам, дзе ўславілася іхнае войска. Кожны ведае пра геройскую бітву са школьных падручнікаў. Самасьера таленавіта ўвекавечана ў палатне Пётры Міхалоўскага і рамане Стэфана Жэромскага. Што ж адбылося ў 1808 годзе ў пірэнейскай цясьніне? Французы паслалі польскіх уланаў у атаку на артылерыйскія пазыцыі і тыя выканалі задачу, пасекшы абслугу трох гішпанскіх батарэяў. Шлях на Мадрыд быў адкрыты. Уланы страцілі 18 чалавек забітымі і 75 параненымі. На фоне знакамітых бітваў тае пары Самасьера – безумоўна лакальны эпізод, якіх на працягу кожнай ваеннай кампаніі бывае дзясяткі. Лакальны эпізод стаўся элемэнтам нацыянальнага міфа.

„Трижды проклятая Орша"... Злавесным рэхам адгукалася па ўсёй Масковіі імя беларускага горада. Маскоўцы не далічыліся. Толькі ў вялікіх бітвах яны былі бітыя пад Воршай ажно чатыры разы. ***Перамога 8 верасьня 1514 года была самай маштабнай і найслаўвуцейшай***. Беларускае войска, наш народ на працягу 500 гадоў баранілі эўрапейскую цывілізацыю ад расейскага варварства. ***Ворша займае пачэснае месца ў шэрагу вайсковых перамогаў, што вызначылі лёс Эўропы***: бітвы на Каталаўнскіх палях (451 г., рымскія легіёны зьнішчылі гунаў), пры Пуацье (732 г., франкі спынілі арабскае нашэсьце), пры Лепанта (1571 г., флот Каталіцкай Лігі разграміў туркаў). У разгроме крыжакоў пад Грунвальдам (1410 г.) і выратаваньні Вены ад туркаў (1683 г.) беларускія палкаводцы і ваяры адыгралі вырашальную ролю. **Пра гэта ўсе забыліся.**

Паўтысячагоддзя, да самага канца XVIII ст., беларусы засланялі сабой сваю Айчыну і цэлы кантынэнт ад нашэсьцяў маскоўскай арды, утварыўшы вышэйшага ўзроўню школу вайсковага мастацтва, жылі ў вечнай ваеннай гатоўнасьці, пралілі рэкі крыві, урэшце падарвалі свае нацыянальныя сілы – і ад гэтага не засталося, практычна, нічога. На пытаньне мясцовага мытніка пра мэту прыезду ў Беларусь інтэлігентны турыст адказвае: „Хачу пазнаёміцца з гісторыяй вашай краіны". А дробны монстр з чырвоным таўром „таможня" рагоча: „Так ведь тут нет никакой истории".

Школа — невылечны маразматык савецкай сістэмы — тлуміла пакаленьні нашых дзяцей біяграфіямі маскоўскіх цароў, Суворавым і партыйнымі зьездамі, ні словам не згадаўшы пра ***Воршу***, пра нашу славу і трагедыю. На будынках нашых вакзалаў вісіць прыплюснутая ў рэльеф галава Леніна (праўда, ён праязджаў тут на шляху ў эміграцыю і выйшаў з вагона на пару хвілінаў, каб купіць піражкі). А магілы беларускіх герояў, палі вайсковай хвалы — пазарасталі быльнягом. Ім няма помнікаў, іх паглынула амнэзія.

Суседзі актыўна пакарысталіся ненармальным станам нацыянальнай памяці, выкліканым расейскай акупацыяй і зьнішчэньнем Беларускай дзяржавы і нашай эліты.

Разгортваем школьны падручнік віленскага выданьня 1993 г. на расейскай мове „История Литвы": на адпаведнай старонцы вядомая гравюра і назва главы „Победа литовцев под Оршей". Вось так... Працэс абуваньня ў лапці нашага народу – адна з прыярытэтных функцыяў расейскіх, польскіх, летувіскіх і ўкраінскіх гісторыкаў. З іхняй падачы неякасны інтэлектуальны прадукт трапляе ў замежныя энцыкляпэдыі і г.д. Нам столькі гадоў расказвалі сафістычныя байкі пра нас саміх („беларусы рахманыя і невяўнічыя", „жылі ўвесь час пад польска-літоўскімі фэадаламі", „фармаваньне беларускай нацыі пачалося з канца 18 ст.", „знаете, товарищи, не было таких – белоруссов"), што мы й самі паверылі ў тое, што нас няма.

Шок канца 1980-х гадоў, калі пачаўся новы этап нацыянальнага Адраджэньня, быў дастаткова моцным, каб разьбіць закарэлыя стэрэатыпы. Кнігі расстраляных расейскімі акупантамі гісторыкаў і іхных сучасных вучняў *Міколы Ермаловіча*, *Уладзімера Арлова*, *Генадзя Сагановіча*, якія ўрэшце дайшлі да чытача, абумовілі сапраўдную інтэлектуальную рэвалюцыю. Ужо праз колькі гадоў лукашэнкаўскія інквізытары пачалі паліць беларускія падручнікі і пляжыць гістарычную традыцыю, настаўніцтва было вернута ў хамут служэньня антыбеларускім псэўдакаштоўнасьцям. Сьвятыя вобразы зноў замянілі маскоўска-акупанцкім шалупіньнем кшталту курса „Истории Отечества" ды „агульнарэспубліканскай" п'янкі ў „День защитника Отечества" 23 лютага.

Але калгасная дыктатура ўжо ня мае абсалютнай моцы над духоўным жыцьцём нацыі. Ужо мы не дазволім сьцерці яшчэ раз імя тройчы ўслаўленай Воршы і ўсю беларускую ваенную гісторыю з нацыянальнай памяці.

Гістарычная тэма ў беларускім мастацтве знаходзіцца ў эмбрыянальным

стане. Старонкі раманаў *Уладзімера Караткевіча* і *Кастуся Тарасава*, графічныя аркушы *Міхаіла Басалыгі* і *Рыгора Сітніцы*, балет *„Рагнеда”*— ці не замала яркіх твораў на 10-мільённую нацыю? Хаця што зробіш, калі найлепшыя дасягненьні падцэнзурнага мастацтва БССР належалі жанрам нацюрморта і краявіда? А на плошчах нашых гарадоў дагэтуль стаяць бальшавіцкія ідалы, іхнімі імёнамі дагэтуль названыя вуліцы.

Баляслаў Прус сьмяяўся вуснамі сваіх егіпецкіх герояў над элінамі, якія на матэр’яле пірацкай экспэдыцыі ў Трою зрабілі ўзьнёслы эпас. Нам жа трэба толькі абярнуцца ў мінуўшчыну — і адкрыюцца скарбы, якім пазайздросьціць любы, самы клясычны народ. Пакуль што ў велічны гмах Гістарычнай Памяці беларускімі творцамі пакладзеныя нямногія цаглінкі.

***Зьбіраньне камянёў нашай мінуўшчыны ёсьць наша задача.*** На чужынцаў няма спадзяваньня. Расеец не дакажа праўды пра 1382 год. Калі хан Тахтамыш падышоў да Масквы, адтуль уцякла ўся дзяржадміністрацыя начале з князем Дзімітрыем і мітрапалітам Кіпрыянам. Маскоўскі люд пачаў піць, гуляць і рабаваць. У горадзе запанаваў хаос, аж покуль ліцьвіны не ўзялі справу абароны ў свае рукі: *князь* ***Асьцей*** (яго называюць унукам Альгерда) арганізаваў абарону на мурах і парадак на вуліцах, а *рамесьнік Адам* камандаваў артылерыяй. І каб не маскоўская дурата, то горад бы не загінуў.

Ня скажуць яны праўды і пра 1812 год, калі ў Барадзінскай бітве сталі па абодва бакі фронту па законах грамадзянскай вайны ***беларускія палкі***. І польскі інтэлектуал не дакажа праўды. Мельхіёр Ваньковіч у сваёй знакамітай манаграфіі „Монтэ-Касіна”, прысьвечанай перамозе арміі генэрала Андэрса ў Італіі ў 1944 г., згадвае слова „беларус” роўна два разы



***Беларуская гармата (Польшча. Баранаў-Сандамірскі. Замак XVII ст.)***

на 350 старонак. Прычым адна са згадак інфармуе пра ўцёкі ў нямецкі палон (прозьвішчы, аднак, не пададзены). Калі ж чытаеш сьпісы загінуўшых, што падаюцца ў апараце кнігі, то ясна разумееш, што больш за палову герояў беларусы і украінцы.

На тэрыторыі мэмарыялу ў Монтэ-Касіне цяпер ёсьць алея сьцягоў. Там лунаюць дзяржаўныя сьцягі Індыі і Пакістану (у 1944 г. такіх дзяржаваў ня было), бо ў штурме ўдзельнічалі брытанскія каляніяльныя часткі. Беларускага сьцяга там няма.

Антуан-Жан Гро ўразіў сучасьнікаў яшчэ адным палатном – „Напалеён ў бітве пад Эйлаў”. Імпэратар аб’язджае на кані поле бітвы. Снег засыпае груды трупаў. Паранены чалавек у расейскім мундзіры няўклюдна паўзе і цягне руку да пераможцы. Нехта са сьвіты пераказаў потым гэты эпізод жывапісцу. Паранены казаў Банапарту, што хацеў бы служыць у ягоным войску. Казаў, што ён ліцьвін, мабілізаваны маскоўцамі на абарону іхняй імпэрыі. Цяпер кожны экскурсавод па Луўру расказвае перад карцінай пра „літоўца” (канешне ж, паводле ўсіх крыніцаў – „lituanien”). Беларус на чужой вайне за чужыя інтарэсы, у чужым мундзіры, а ў дадатак яшчэ пад чужым імем – і так 200 гадоў пасьля згубы сваёй дзяржавы.

***Вечна так ня будзе.*** Наш народ урэшце адбудуе сваю эўрапейскую дзяржаву і дасьць адэкватную ацэнку сваёй мінуўшчыне. Беларускае войска скіне з сябе маскоўскую мішуру. Будуць у нас Аршанскі, Грунвальдскі і Грозаўскі гвардзейскія палкі, службу ў якіх моладзь будзе лічыць за гонар.Будзе Вайсковая Акадэмія імя *князя* ***Канстанціна Астрожскага***, у якой на дзяржаўнай мове будуць выхоўваць абаронцаў Айчыны паводле багацейшых мілітарных традыцыяў беларускай нацыі.

А ***Дзень Беларускай Вайсковай Славы 8 Верасьня*** будзе дзяржаўным, усенародным сьвятам.

*Верасень 2002 г.* **Валеры БУЙВАЛ**

# РАЗВАГІ АБ БЯГУЧЫМ МОМАНЦЕ

***(Вытрымкі з выступу на Сойме БНФ 10 жніўня)***

Галоўнае пытаньне — пагроза з Усходу, якая павялічваецца і набывае ўсё больш цынічныя і агрэсіўныя формы.

Расейскія гэбоўцы адкрыта заявілі пра пляны захопу (анэксіі) нашай краіны. У нармальных абставінах і ў нармальным грамадстве да гэтакіх заяваў трэба адносіцца вельмі сур’ёзна, бо гэта ёсьць папярэджаньне пра вайну.

Перад беларусамі стаяць зараз дзьве задачы: палітычна прадухіліць анэксію і падрыхтавацца да барацьбы па абароне краіны (з прычыны пагрозы анэксіі). У выпадку агрэсіі гэтага вымагае грамадзянскі абавязак і Канстытуцыя.

У выпадку анэксіі, калі ня будзе збройнага супраціўленьня акупантам з боку беларусаў, Беларусь гэтай чарговай расейскай акупацыі ўжо можа не перажыць. (Нацыю вынішчаць пры дапамозе Захаду па новых тэхналёгіях.) Збройнае змаганьне ў такіх абставінах будзе абавязковай умовай захаваньня незалежнасьці і нацыянальнай будучыні.

Улічваючы становішча, мы мусім арганізаваць надзвычайныя высілкі па першай грамадзкай задачы — палітычным прадухіленьні анэксіі і недапушчэньні захопу нашай краіны.

Мы павінны зыходзіць ня толькі з ужо існуючай рэальнасьці (якая дэманструе нашыя абмежаваныя магчымасьці), але мець на ўвазе і нашу агромністую патэнцыяльную сілу, якая можа паўстаць (пры правільным разуменьні, правільных дзеяньнях і правільнай палітыцы).

Трэба ўлічваць маральна-палітычны заняпад у сьвеце, з прычыны ягонай аднапалярнасьці і дамінацыі левых сілаў. Неабходна мець на ўвазе будаўніцтва ў Эўропе новай лібэральнай імпэрыі на базе агульных матэрыяльных інтарэсаў (агульнага рынку) і пры поўнай адсутнасьці ідэяў. Трэба зважаць на нямецка-расейскія інтарэсы і агульную нямецка-расейскую палітыку (асабліва, што датычыць Беларусі, Калінінградзкай вобласьці і Польшчы). Мы мусім зыходзіць з верагоднасьці амэрыкана-іракскай вайны, якая можа справакаваць агрэсію Крамля супраць Беларусі. (Амэрыцы будзе не да нас, а цана на нафту ўзрасьце, што павялічыць прыбыткі і магчымасьці Расеі.)

* * *

Прыходзілася ўжо ня раз пісаць, што ня гледзячы на адданасьць Маскве,

Крэмль адносіцца да сваіх паслугачоў з гэбоўска-намэнклятурнай грэблівасьцю. Падзеі траўня-чэрвеня (заявы У.Пуціна пра Беларусь) зноў ілюструюць, што Маскве патрэбныя беларуская тэрыторыя, зямля, прамысловасьць, рэсурсы, але не Лукашэнка. Калі б толькі яны Беларусь загрэблі, то Лукашэнка быў бы імі зьнішчаны (спачатку палітычна, а потым і фізічна; спосабаў у іх хапае).

Ня выключана, што узурпатар улады на Беларусі гэта у стане зразумець, але (улічваючы ягоную псіхалёгію) наўрад ці паверыць, што такое можа стацца. Сёньня мы бачым, як Масква спрабуе дрэсіраваць свайго васала на дармовую здачу краіны, і як ён няўклюдна не паддаецца, імкнучыся захаваць асабісты інтэрас.

Увага. Тут узьнікаюць складаныя дачыненьні, якія вымагаюць беспамылковых ацэнак. Зьвярніце ўвагу, што ў канфлікце Масквы з Лукашэнкам ягоная „апазыцыя" і ўся гэтая агентурная так званая „дэмакратычная" шваль (якая камэнтуе спрэчныя дачыненьні), прымае неўпрыкмет пазыцыю Крамля. Ім хочацца (усім гэтым „былым", якіх ён вытурыў), каб Масква дала ў косьці ўзурпатару і пакарала б іхняга крыўдзіцеля. І ня важна, якой цаной. Хоць справа йдзе пра цану Беларусі, а пазыцыя дыктатара (напрыклад, у жаданьні не аддаваць нацыянальную ўласнасьць задарма) часова супадае зь беларускім нацыянальным інтарэсам.

Вось вам яшчэ адна ілюстрацыя выкарыстаньня Масквой „кіруемага канфлікту" у адзінай сазлучанай сістэме: „рэжым — апазыцыя". Выкарыстоўваецца псіхалёгія пакрыўджаных халуёў, з улікам адсутнасьці ў іх сьведамага нацыянальнага думаньня.

Зважайма. Мы — адраджэнцы — ня мусім нічаму перашкаджаць, што спрыяе ўмацаваньню суверэнітэту і дзяржаўнасьці Беларусі (нават калі якія-небудзь дзеяньні вымушана зыходзяць ад нашых праціўнікаў). Але пры гэтым мы павінны праводзіць сваю актыўную нацыянальную палітыку, каб не апынуцца ў залежнасьці ад палітыкі чужой.

Гэта адзін аспэкт нашай паставы ў ацэнцы ўзаемадачыненьняў рэжыму і ягонай „апазыцыі" з Масквой.

Ёсьць другі аспэкт, ня менш важны, які вымагае ад нас пэўнай дыпляматыі і ня мусіць быць на віду. Таму пра яго гаворыцца, але ня пішыцца. З улікам другога аспэкту, мы мусім будзем добра прааналізаваць сытуацыю і праводзіць палітыку, якая спрыяла б абароне незалежнасьці краіны і дапамагала б выхаду з дыктатуры.

* * *

Цяпер вельмі выразна і адкрыта відаць „пакрокавая" тактыка Масквы ў падрыхтоўцы захопу нашай краіны і вынішчэньні ўсяго беларускага. З прыходам Пуціна да ўлады ў Расеі дзеяньні рэжыму на Беларусі набываюць асабліва грубы і цынічны, адкрыта акупацыйны характар.

У захопніцкай палітыцы Расея (як і немцы, і любая імпэрыя) заўсёды старалася стварыць на тэрыторыі краіны, якую зьбіраецца акупаваць, канфлікт пакрыўджаных, прэцэдэнт быццам бы парушэньня правоў нейкай групы (за якую Расея пачынае ўступацца). Пасьля гэтага ўламваліся „спасаць" то „праваславіе", то „рускаязычных", то „па просьбе трудзяшчыхся" ды „брацкіх партій", то каб „зьнішчыць тэрарыстаў" (узарваўшы папярэдне дамы і людзей у Расеі), то проста „з гуманных меркаваньняў", каб „грэзіць шведу" і г.д.

Цяпер Масква, выкарыстоўваючы рэжым Лукашэнкі, пачынае акурат новую авантуру на Беларусі: плянуе пасварыць наш народ на рэлігійнай глебе, скарыстаўшы поліканфэсійнасьць беларускай нацыі. Схема канфлікту расплянавана груба і лапідарна. Падрыхтаваны праект закона, дзе ўсе правы даюцца кагэбізаванай Рускай Праваслаўнай Царкве на Беларусі. Чужая царква (якая ў меншасьці) атрымлівае ўсе правы. Астатнія беларускія канфэсіі (якіх большыня) пазбаўляюцца элемэнтарных правоў. Плян просты, як кол. Генэральскае думаньне. Спадзяюцца падставіць папоў (у пагонах), і потым — „зашчышчаць абіжаных".

Я не спыняюся больш падрабязна на гэтай палітыцы Масквы. (Яна тут не складаная, варварская і добра вядомая.)

Хачу толькі яшчэ падкрэсьліць, што палітычная партыя не павінна ўмешвацца ў канфэсійныя і рэлігійныя дачыненьні. Сьцеражы нас Бог цягнуць папоў, ксяндзоў, ці якіх-небудзь рэлігійна скасабочаных людзей ў палітыку.Тут — табу. Тым больш, што адзінства нашага народа трымаецца на беларускай нацыянальнай культуры, і ні на чым іншым. (У пляне рэлігіі мы — не ірляндцы, і нават не палякі.) У цяперашніх варунках ***самая вялікая дзейнасьць у Беларусі, якая стаіць над усім, — гэта палітыка***.

*10 жніўня 2002 г.* **Зянон ПАЗЬНЯК**

# ГАЛАСЫ З КУРАПАТАЎ

*1-га чэрвеня* сябры Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — Беларускі Народны Фронт арганізавалі талаку ў Курапатах. Ставілі крыжы.

Сакратар Управы БНФ ***Алесь Чахольскі*** сказаў: „Хочацца, каб кожны чалавек падумаў і паглядзеў свой радавод. Я мяркую, што ў кожнага ў сям'і знойдзецца ці закатаваны дзядзька, ці бацькі, ці дзед. Таму маральны абавязак гэтага чалавека — вырабіць крыж і ўсталяваць яго ў Курапатах".

***Сяргей Мацкевіч*** прышоў у Курапаты на талаку разам з жонкай. Сяргеевага дзеда, ***Сыльвэстра Мацкевіча***, расстрэльвалі ў Курапатах, але той цудам застаўся жывым.

„Перад самай вайной, — кажа спадар Мацкевіч, — дзеда з Драгічынскага раёна забралі сюды. Тут яго стралялі, але ён стаяў у другім шэрагу, і яго не застрэлілі. Разам зь нейкім іншым вязьнем, што таксама цудам ацалеў, яны выбраліся з-пад трупаў і пайшлі ў бок хаты. Пакуль вярнуліся дахаты, пачалася вайна. У 44-м ён убачыў, што савецкія войскі наступаюць, зразумеў, што будуць зноў яго страляць, і пайшоў у бок захаду (Польшча, Нямеччына). У 1949-м апынуўся ў Амэрыцы. Потым, пазьней, расказаў пра гэтыя падзеі і пра ўсё, што зь ім было, па радыё. У 1986-м ён памёр. Так мы і ня ўбачыліся".

Курапаты ў гэты дзень наведаў вядомы літоўскі пісьменьнік ***Томас Венслава***. Ён сказаў, што Курапаты важныя ня толькі для Беларусі, але і для ўсяго чалавецтва. Курапаты, паводле Томаса Венславы, можна паставіць у адзін шэраг з такімі месцамі, як Асьвенцым і Майданэк. Ён нагадаў пра літоўскі досьвед у справе ўшанаваньня бязьвінных ахвяраў сталінскага рэжыму, пра тое, як летувісы вывозілі парэшткі сваіх грамадзянаў у Сібіры і расейскай Поўначы, як ставілі помнікі ахвярам рэпрэсіяў.

***(Паводле радыё. Г. Соўсь)***

# ГЭБІЗМ* БЕЗ ДЫПЛЯМАТЫІ

15 жніўня, адразу пасьля агрэсіўнай заявы Пуціна супраць Беларусі, расейскае тэлебачаньне *НТВ* (перадача на замежжа) паказала інтэрв'ю з старшынёй ЦВК Расеі А. Вішняковым (кадравым гэбістам). Падаём вытрымкі з гэтага інтэрв'ю.

**Вядучы**: — Як вы адносіцеся да прапановы Пуціна? (Да заявы пра анэксію Беларусі, — *рэд.*)

**Вішнякоў**: — Ідэя абсалютна здаровая, ідэя, урэшце рэшт, ад якой выйгралі б народы.

**Вядучы**: — У чым выйгралі?

**Вішнякоў**: — Названыя два варыянты. Розьніца вялікая, бо тут (1-ы варыянт — анэксія, адна дзяржава, — *рэд.*) выразныя, зразумелыя мэханізмы кіраваньня гэтай дзяржавай, правы і абавязкі грамадзянаў, абарона гэтых правоў грамадзянаў. Гэта мэханізм функцыянаваньня дзяржавы. А там (2-гі варыянт — саюз дзяржаваў, — *рэд.*) — гэта трохі аморфнае ўтварэньне, якое, як правіла, потым пераходзіць у гэтую саюзную адзіную дзяржаву. Таму калі не гатовыя адразу зрабіць і перайсьці да адзінай дзяржавы, прамежкавы мадэль — гэта „Эўразьвяз", а ў канцовым выніку, гэта напэўна — адзіная дзяржава.

* * *

У гэты ж дзень, 15 жніўня, беларуская рэдакцыя радыё „Свабода" трансьлявала інтэрв'ю з актывістам вікаўскай „апазыцыі"** Юры Хадыкам. Пытаньне было зададзена пра сустрэчу Пуціна з Лукашэнкам і пра агрэсіўную заяву расейскага прэзыдэнта. Ю. Хадыка сказаў наступнае: „Мне спадабалася ўчорашняя сустрэча, таму што яна выклікала ў мяне сімпатыю да абодвух прэзыдэнтаў. З майго пункту погляду, Пуцін, як чалавек рацыянальны, адчайна спрабаваў выйсьці са сфэры ірацыянальнага, той сфэры, дзе да сёньняшняга дня абарочвалася гэта ідэя саюза.

Ён абсалютна разумна, абгрунтавана прапанаваў як найзразумелыя і кантралюемыя мадэлі. І гэта паставіла, безумоўна, спадара Лукашэнку ў вельмі цяжкую сітуацыю. Ягоныя словы, якія ён сказаў у менскім Аэрапорце-2 наконт таго, што на рэфэрэндуме, калі будзе пастаўлена праблема ўваходжаньня ў склад Расейскай Фэдэрацыі не суб'ектам, то кожны беларус прагаласуе супраць. Пагэтаму я лічу, што праблема саюза (як бы паглынаньне Беларусі) не наблізілася, а толькі аддалілася".

* * *

А перад гэтым, 16 чэрвеня, пасьля першых заяваў Пуціна пра намер Масквы анэксаваць Беларусь (пра „мухі ды катлеты") выступіў на радыё „Свабода" яшчэ адзін „тытан думкі" — былы лукашэнкаўскі міністар і амбасадар Міхаіл Марыніч. Вялікі „апазыцыянэр" даў ацэнку заявам і сказаў наступнае: „Гэта вельмі добра, калі прэзыдэнт Расеі канчаткова зразумеў, што прэзыдэнта Лукашэнку не турбуе эканоміка нашай радзімы. Ён дамагаецца кіраваць ня толькі Беларусьсю, але і Расеяй. Таму што вельмі падштурхоўвае расейскіх сваіх паплечнікаў, каб хутчэй утварыць наддзяржаўныя органы ўлады.

Пуціну гэта ня трэба. Ён усьвядоміў, зразумеў, што беларусы жадаюць мець самастойную, суверэнную краіну.

Гэта перамога дэмакратычных сілаў Беларусі.

Я ўпэўнены, што Пуцін адступаць ня будзе", — падсумаваў „дэмакрат" Марыніч.

Як кажуць, пакідаем гэта без камэнтароў. І так зразумела. Бо лепш ня скажаш, чым сказалі гэтыя „геніі" крамлёўскай „дэмакраты".

***Адам МІКША***

* Маецца на ўвазе „гэбізм" як накірунак (характар) цяперашняй рускай палітыкі і вобраз думаньня.

** Перад гэтым (пасьля нікчэмных прэзыдэнцкіх выбараў) Ю. Хадыка назваў вікаўскую „дэмакратычную апазыцыю" „сольлю зямлі" і засьведчыў, што яе арганізаваныя формы ўтвораныя летам 1999 года „па ініцыятыве КНГ АБСЭ", якой кіраваў Ганс Вік (гл. Народная Воля, — 2001, 18 сьнежня)

# ЛЕТАМ У ВІЛЬНІ

*13-14 ліпеня ў Вільні* адбылася ІІІ-я Канфэрэнцыя Беларусаў Балтыі. У Базылянскіх мурах, як некалі, сабраліся прадстаўнікі беларусаў з шасьці краінаў Балтыйскага рэгіёну і госьці з Канады, Францыі, Аўстраліі, Вялікабрытаніі, ЗША і інш. краінаў.

Пра тое, як праходзіла канфэрэнцыя, было шмат інфармацыі ў друку. Прынята пяць рэзалюцыяў.

У рэзалюцыі „Аб пагрозе незалежнасьці Беларусі" дэлегаты адзначылі „*узмацненьне расейскай палітычнай агрэсіі, накіраванай на зьнішчэньне незалежнасьці Беларусі і падрыхтоўку анэксіі нашай краіны.*

*... Мы зьвяртаемся да Кангрэсу Злучаных Штатаў Амэрыкі і парляманту Вялікабрытаніі — краінаў, якія з 1994 года зьяўляюцца гарантамі незалежнасьці Беларусі, — з просьбай прыняць прэвентыўныя захады па ўзмацненьні гарантыяў незалежнасьці Рэспублікі Беларусь з мэтай памяншэньня пагрозы для суверэнітэту нашай краіны.*

*Расея мусіць спыніць свае пляны і вялікадзяржаўную палітыку супраць Беларусі.*

*Мы інфармуем таксама дэлегатаў Арганізацыі Аб'еднаных Нацыяў і просім прыняць адмысловую рэзалюцыю аб недапушчэньні плянаў палітычнай агрэсіі з боку Расеі ў дачыненьні да Рэспублікі Беларусь".*

Быў прыняты таксама зварот да кіраўніцтва Эўразьвязу, які друкуем тут цалкам.

*„Мы, удзельнікі III Канфэрэнцыі Беларусаў Балтыі, з трывогай даведаліся, што* ***Эўразьвяз прапануе краінам Балтыі ўстанавіць на мяжы нашых дзяржаваў жалезную заслону часоў „халоднай вайны"****.*

*Неабходнасьць такіх дзеяньняў вельмі сумніўная, бо парушае асноўныя правы чалавека на вольнае перамяшчэньне ў межах аб'яднанай Эўропы.*

*Беларусь шмат стагоддзяў была паўнапраўным сябрам эўрапейскай супольнасьці, фарпостам хрысьціянскай цывілізацыі на Ўсходзе і падзяляла агульнаэўрапейскія этычна-маральныя каштоўнасьці.*

*Штучны падзел Эўропы на асобныя часткі прывядзе да шматлікіх сямейных трагедыяў, паўплывае на магчымасьць моладзі атрымаць адукацыю за межамі сваёй краіны і гэтак далей.*

*Мы спадзяёмся, што падчас будаўніцтва аб'яднанага эўрапейскага дому будуць улічаны і правы грамадзянаў Беларусі."*

Кіраўніцтва Летувы было зацікаўлена ў пэўных рашэньнях Канфэрэнцыі (па НАТО, напрыклад), таму прысутнічалі кіруючыя 2-я асобы з Сейму і Ўраду, а таксама дэпутаты парляманту.

***Ф. ГРАЖЫНОВІЧ***

# ПАЛІТЫКА ВЫНІШЧЭНЬНЯ

*Сойм Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне" і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ на паседжаньні 22 чэрвеня прыняў Зварот да парляманстаў краінаў-удзельніц АБСЭ і Рады Эўропы „Аб прычынах выдаленьня КНГ АБСЭ зь Беларусі"; а таксама заяву „Аб этнацыдзе і вынішчэньні Беларускай нацыі". Гэта істотныя дакументы ў пляне аналізу і ацэнкі палітыкі ў Беларусі. Друкуем цалкам.*

* * *

## *АБ ПРЫЧЫНАХ ВЫДАЛЕНЬНЯ КНГ АБСЭ ЗЬ БЕЛАРУСІ*

Зь Беларусі адміністрацыйным шляхам імкнуцца выдаліць Кансультацыйна-назіральную групу АБСЭ. Міністэрства замежных справаў Беларусі не прадаўжае і не выдае візы супрацоўнікам КНГ АБСЭ ў Менску. Гэта ёсьць чарговы акт лукашэнкаўскага рэжыму пасьля апэрацыі „Дразды", калі ў 1997 г. амбасадары замежных дзяржаваў былі гвалтоўна выдаленыя са сваіх рэзыдэнцыяў. Такім чынам рэжым стварае Беларусі імідж дзяржавы-ізгоя.

Наіўна было б разглядаць гэтыя працэсы як самастойныя дзеяньні менавіта лукашэнкаўскага рэжыму. Міжнародная, дыпляматычная дзейнасьць рэжыму праводзіцца пад дыктоўку Масквы. Мяркуем, што ні для каго не зьяўляецца сакрэтам, што рэгулярна праводзяцца сумесныя (Беларусі і Расеі) паседжаньні калегіяў міністэрстваў замежных справаў, КГБ і ФСБ, міністэрстваў унутраных справаў, міністэрстваў абароны, міністэрстваў юстыцыі ды іншых міністэрстваў і ведамстваў, якія вызначаюць зьнешнюю і ўнутраную палітыку Беларусі. Зразумела, што ўдзел расейскіх кіраўнікоў і спэцыялістаў у працы беларускіх дзяржаўных ведамстваў мае аднабаковы характар, палітыка лукашэнкаўскага рэжыму выпрацоўваецца і карэктуецца ў інтарэсах Расеі. Мяркуем, што ў дыпляматычных колах Эўропы добра вядома, якую палітыку праводзяць такія „спэцыялісты" КГБ-ФСБ, як У. Латыпаў і Л. Ерын, камандыраваныя Масквой на адказныя пасады ва ўрад Лукашэнкі.

Выдаленьне зь Беларусі КНГ АБСЭ ўваходзіць у пляны Расеі. Расея імкнецца выкарыстаць міжнародную сітуацыю, якая ўзьнікла ў сувязі з барацьбой з тэрарызмам. Пад барабанны бой „барацьбы з тэрарызмам"



Фота А. Сталярова

*Чорны ідал (Ашмяны)*

Расея плянуе на працягу бліжэйшага часу ў гэтым і насупным годзе завершыць захоп Беларусі. Таму знаходжаньне КНГ АБСЭ стала супярэчыць інтарэсам Расеі. Узьнікла неабходнасьць пазбавіцца ад любога міжнароднага кантролю, які хаця б ускосна дазваляў бы зафіксаваць гвалтоўную акцыю па ліквідацыі дзяржаўнасьці Беларусі.

Расея падрыхтавала „юрыдычны" грунт для анэксіі Беларусі. У канцы 2001 г. у Расеі прыняты закон „О порядке принятия в Российскую Федерацию и образовании в её составе нового субъекта Российской Федерации", а таксама знаходзіцца на этапе прыняцьця закон „О борьбе с экстремизмом". Пасьля гвалтоўнага правядзеньня „аб'яднаўчага рэфэрэндуму" Расея мяркуе перавесьці Беларускі нацыянальна-дэмакратычны вызвольны адраджэнцкі рух у статус „тэрарыстаў" і такім чынам канчаткова давершыць дзьвюхсотгадовую зьнішчальную вайну супраць беларусаў. 13 чэрвеня сёлета пасьля перамоваў у Пецярбургу прэзыдэнт Расеі Пуцін зрабіў заяву, у якой адкрыта засьведчыў, што Расея ў сваёй палітыцы робіць стаўку на анэксію Беларусі. Нікога не павінна ўвесьці ў зман разгорнутая пасьля гэтай заявы расейскімі і беларускімі СМІ інфармацыйная кампанія пра „супярэчнасьці" паміж Пуціным і Лукашэнкам на шляху стварэньня так званай „саюзнай дзяржавы". Гэта ёсьць інфармацыйная заслона, „спэктакль", распрацаваны і разыграны спэцслужбамі ў лепшых традыцыях КГБ. Галоўнымі акцёрамі ў ім выступаюць Пуцін і Лукашэнка.

Расея захапіла ў 1994 г. ключавыя пасады ў выканаўчай уладзе на Беларусі, выкарыстоўваючы „рычагі ўплыву", галоўным зь якіх зьяўляецца захаваная пасьля распаду СССР татальная сетка сістэмы КГБ. Праз агентуру, якая дзейнічала ў беларускім урадзе, былі спыненыя рэформы ў эканоміцы і адраджэнцкія працэсы ў культуры, адукацыі, інфармацыйнай сфэры.

Зараз ужо сталі відавочнымі адкрытыя і таемныя пляны Крамля па зьнішчэньні дзяржаўнасьці Беларусі:

– кансэрвацыя савецкіх парадкаў у эканоміцы;

– рэстаўрацыя савецкай сымволікі (гэрб, сьцяг);

– спыненьне і ліквідацыя адраджэнцкіх працэсаў, зьнішчэньне беларускай школы, адукацыі, культуры;

– русіфікацыя ўсіх сфэраў сацыяльна-культурнага жыцьця, інфармацыйнай прасторы, школы, адукацыі;

– разбурэньне нацыянальна-дэмакратычных палітычных рухаў і арганізацыяў;

– правядзеньне сацыяльнай, эканамічнай і міграцыйнай палітыкі па выцісканьні зь Беларусі адукаванай, актыўнай часткі беларускага народу;

– пасьлядоўнае наладжваньне кантролю і кіраваньне дзейнасьцю ўсіх асноўных міністэрстваў і ведамстваў праз уплыў на кадравую палітыку і мэханізмы так званай „саюзнай дзяржавы", праз правядзеньне сумесных калегіяў;

– уключэньне беларускага войска ў склад расейскай вайсковай групоўкі, выкарыстаньне тэрыторыі Беларусі для стварэньня стратэгічнага ваеннага пляцдарму;

– задушэньне беларускага бізнэсу, жорсткае падпарадкаваньне эканомікі Беларусі расейскаму сыравіннаму і таварнаму рынку, недапушчэньне прыватызацыі зямлі і рэформаў у сельскай гаспадарцы;

– палітычная і эканамічная ізаляцыя ад заходніх цывілізаваных краінаў;

– штучнае стварэньне запазычанасьці беларускіх прадпрыемстваў, рабаўнічая „прыватызацыя" беларускай уласнасьці расейскім капіталам;

– прыватызацыя банкаўскай сфэры, увядзеньне расейскага рубля ў якасьці валюты ў Беларусі;

– „юрыдычнае" афармленьне анэксіі Беларусі.

На працягу апошніх гадоў мы неаднаразова зьярталі ўвагу АБСЭ на тое, што рэжым Лукашэнкі народжаны Масквой дзеля ліквідацыі незалежнасьці і дзяржаўнасьці Беларусі, што дыктатура Лукашэнкі ініцыяваная Масквой з мэтай захопу Беларусі, яе інтэлектуальных, прыродных і тэрытарыяльных рэсурсаў. Расея застасавала пры гэтым

сучасныя тэхналёгіі вядзеньня вайны, галоўнымі відамі зброі ў якой зьяўляюцца спэцслужбы, інфармацыйная, эканамічная і палітычная агрэсія, экспансія расейскай псэўдакультуры.

Пачынаючы з 1997 г. Расеі ўдалося выкарыстоўваць структуры АБСЭ дзяля сваіх інтарэсаў. Чыноўнікі АБСЭ, якія кіравалі КНГ АБСЭ ў Менску і якія прыязджалі ў Менск у якасьці экспэртаў, упарта не хацелі заўважаць, што ўсталяваньне і існаваньне рэжыму Лукашэнкі ёсьць вынікам расейскай імпэрскай палітыкі. На Беларусі КНГ АБСЭ разгарнула кіруемы канфлікт. ***Нямецкі дыплямат Г. Вік, які ўзначаліў КНГ АБСЭ ў Менску, праводзіў актыўную працу па стварэньні прамаскоўскай апазыцыі Лукашэнку з ліку былой камуністычнай намэнклятуры і былых прыхільнікаў Лукашэнкі. Адначасна рабілася ўсё, каб разваліць рэальную нацыянальна-дэмакратычную апазыцыю***.

Міжнародная арганізацыя, якая згодна свайго статута павінна забясьпечваць стабільнасьць у Эўропе, супроцьдзейнічаць агрэсіі, была выкарыстаная асобнымі яе чыноўнікамі для супроцьлеглай мэты. На працягу 1999-2001 г.г. мы зьярталіся да КНГ АБСЭ ў Менску і да цэнтральных органаў АБСЭ ў Вене з патрабаваньнем *спыніць антыбеларускую дзейнасьць чыноўнікаў АБСЭ сп. Г. Віка і А. Севярына, якія праводзілі палітыку спрыяньня расейскай анэксіянісцкай палітыцы на Беларусі*.

Вось этапы антыбеларускай дзейнасьці КНГ АБСЭ ў Менску:

— стварэньне кіруемай „аб’яднанай апазыцыі” з удзелам прарасейскіх камуністаў, лібэрал-дэмакратаў і сацыял-дэмакратаў з шэрагаў савецкіх прафсаюзаў;

— удзел у разбурэньні Беларускага Народнага Фронту і ператварэньне адкалоўшайся яго часткі ў памагатых намэнклятурнай „аб’яднанай апазыцыі”;

— ініцыяваньне псэўдаперамоўнага працэсу паміж „аб’яднанай апазыцыяй” і рэжымам з мэтай паралізацыі рэальнага змаганьня з захопніцкай палітыкай Расеі;

— інфармацыйнае спрыяньне ідэнтыфікацыі рэжыму Лукашэнкі як „самастойнага і незалежнага ад Масквы” у інфармацыйнай прасторы заходніх дэмакратычных краінаў;

— уцягваньне „аб’яднанай апазыцыі” у палатныя выбары 2000 г.;

— актыўны ўдзел у стварэньні і фінансаваньні псэўдакааліцыі пад лёзунгам „адзінага кандыдата” з пяцёх прадстаўнікоў камуністычнай намэнклятуры на прэзыдэнцкіх выбарах 2001 г.;

— каардынацыя дзейнасьці з расейскімі структурамі па кіраваньні акцыяй „адзіны кандыдат” і вылучэньне самага слабога прадстаўніка з пяцёркі кандыдатаў кааліцыі „адзіны кандыдат” – дзеяча савецкіх прафсаюзаў У. Ганчарыка, які ня меў аўтарытэту сярод выбаршчыкаў (такім чынам былі створаныя ўмовы для „перамогі” Лукашэнкі);

У канцы траўня 2002 г. падчас закрытага слуханьня ў лукашэнкаўскім

Псэўдапарляманце, прысьвечанага адносінам з АБСЭ, ***кіраўнік КГБ Л. Ерын і міністр замежных справаў М. Хвастоў пацьвердзілі, што Г. Вік спрыяў рэжыму Лукашэнкі*** *(газэта „Наша Ніва” за 31.05.2002 г.).*

Некаторыя эўрапейскія палітыкі зрабілі больш адкрытыя выказваньні. Так, у сьнежні 2001 г. на запрашэньне амбасады Францыі Менск наведаў прафэсар Альфрэд Гросэр, якога „Деловая газета” (за 19.12.2001 г.) прадставіла «великим вдохновителем создания единой Европы» і прыняла ягоныя выказваньні: **«сейчас мы в ожидании каких бы то ни было объединительных процессов на постсоветском пространстве.** Конечно, не считая прибалтийских республик – там свои заботы. **Не важно, на какой основе будет просиходить объединение. Главное, чтобы оно происходило»** (!!!).

З 10 па 12 чэрвеня 2002 г. Менск наведала дэлегацыя Парляманцкай Асамблеи Рады Эўропы, якую ўзначальваў прадстаўнік Нямеччыны Вольфганг Бэрэндт, спэцыяльны дакладчык па Беларусі. У той час, калі рэжым Лукашэнкі ўчыняе гвалт у адносінах да КНГ АБСЭ, дэлегацыя ПАРЭ заявіла, што ў Беларусі яна „вывучае зрухі ў бок пашырэньня дэмакратыі”, праводзіць сэмінар з прадстаўнікамі непрызнанага міжнароднай супольнасьцю лукашэнкаўскага псэўдапарляманту, шукае свабоды слова ў гэтым псэўдапарляманцкім утварэньні, „дэпутаты” якога былі нават запрошаныя ў Страсбург.

Падобна на тое, што сп. В. Бэрэндт падхапіў эстафэту ў сп. Віка. Зноў скаардынавана дзейнічаюць расейская і нямецкая дыпляматыя, цяпер ужо ў справе выдаленьня КНГ АБСЭ з Беларусі. Аднак, яны прадстаўляюць гэтую акцыю як праяву самастойнай палітыкі Лукашэнкі, тым самым прыхоўваючы расейскую палітыку.

Складаецца ўражаньне, што Эўропа спакойна назірае, як Расея і Нямеччына, кожная маючы свае ўласныя інтарэсы, вядуць скаардынаваную агрэсіўную палітыку па зьнішчэньні дзяржаўнасьці Беларусі. Рэжым Лукашэнкі існуе да гэтага часу толькі дзякуючы падтрымцы расейскага імпэрскага рэжыму пры згодзе заходніх краінаў.

У сувязі з палітычнай сітуацыяй, якая створана ў нашай краіне, мы ставім наступныя пытаньні да краінаў-удзельніц АБСЭ і ПАРЭ:

**1.** Вы пагадзіліся на захоп Беларусі Расеяй і на зьнішчэньне беларускай дзяржаўнасьці?

**2.** Вы пагадзіліся на зьнішчэньне адметнай беларускай культуры, мовы, на асіміляцыю беларусаў і такім чынам на зьнішчэньне беларускай нацыі, якое праводзіць Расея?

**3.** Вы лічыце, што саступаючы Расеі, якой кіруе КГБ-ФСБ, і ахвяруючы беларускай нацыяй, можна дасягнуць стабільнасьці ў Эўропе?

Мы просім адкрыта і дакладна выказаць вашу пазыцыю па пастаўленых пытаньнях.

Мы спадзяемся на разуменьне нашай пазыцыі і трагічнага становішча на Беларусі Кангрэсам ЗША і Парлямантам Вялікай Брытаніі, краінаў, якія з 1994 г. зьяўляюцца гарантамі бясьпекі і незалежнасьці Беларусі.

Беларускі народ мае права ведаць стаўленьне краінаў Захаду да агрэсіі Расеі супраць Беларусі.

## *АБ ЭТНАЦЫДЗЕ І ВЫНІШЧЭНЬНІ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫ*

Антыдэмакратычны рэжым Лукашэнкі праводзіць на Беларусі вялікадзяржаўную палітыку Расеі (і тых групаў улады, якія кіруюць Расеяй), палітыку этнацыду беларускага народу, вынішчэньня ягоных культурна-этнічных, эканамічных і жыцьцёвых асноваў.

Беларуская нацыя і беларуская культура знаходзяцца пад пагрозай зьнішчэньня.

З сярэдзіны 90-х гадоў мінулага стагоддзя пачалося рэзкае зьмяншэньне насельніцтва Беларусі і нараджальнасьці дзяцей. Моцна скарацілася працягласьць жыцьця беларусаў. (У некаторых мясьцінах мужчыны ўжо не дажываюць да пэнсіі). Павялічылася сьмяротнасьць ва ўсіх групах насельніцтва, катастрафічна ўзрастае колькасьць хранічных захворваньняў, асабліва сярод дзяцей. Шырока распаўсюджваюцца хваробы, якія раней ужо былі фактычна ліквідаваныя (сухоты, сіфіліс, гепатыт), становіцца праблемай СНІД.

Масава распаўсюдзілася п’янства і алькагалізм сярод усіх групаў людзей, у тым ліку – сярод жанчынаў і падлеткаў.

За апошнія сем гадоў насельніцтва Беларусі зьменшылася на паўмільёна чалавек і прадаўжае зьмяншацца з хуткасьцю выміраньня амаль ста тысячаў у год.

Усё гэта адбываецца на фоне агульнага зьбядненьня і крыміналізацыі грамадзтва, павелічэньня колькасьці разбойных нападаў, рабаўніцтва і крадзяжоў. Абнізіўся адукацыйны ўзровень беларускага грамадзтва, зьменшала колькасьць высокаадукаваных людзей, пагоршыліся магчымасьці атрыманьня адукацыі і працы, павялічылася эміграцыя – ад’езд здаровых, маладых і адукаваных людзей за мяжу.

Працэсы сацыяльнай дэградацыі і выміраньня беларусаў ёсьць вынікам этнацыду беларускай нацыі, які праводзіць кіруючы прамаскоўскі рэжым улады. У выніку этнацыду адбываецца зьніжэньне маральнага і культурнага ўзроўню грамадзтва, дзейнічаюць забароны і выяўляецца немагчымасьць культурна-нацыянальнага разьвіцьця. Беларуская нацыянальная адукацыя практычна зьнішчаная. Амаль поўнасьцю

пазачыняныя беларускія школы ў гарадах (дзе найбольшая канцэнтрацыя вучняў) і зачыняюцца па ўсёй краіне. Адукацыя ў вышэйшай школе адбываецца на чужой мове. Беларуская мова фактычна – забароненая, выгнаная з афіцыйнага ўжытку і сродкаў масавай інфармацыі. Беларуская гуманітарная і фундамэнтальная навука разбураецца, адбываецца зададзеная фальсіфікацыя беларускай гісторыі, зьнішчаюцца магчымасьці нацыянальнай творчасьці і разьвіцьця беларускай літаратуры.

* * *

Фізічнае вынішчэньне беларускага народу, генацыд і этнацыд беларусаў аформіліся як дзяржаўная палітыка Расеі адносна Беларусі задоўга да захопу тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII стагоддзя, якому папярэднічалі вынішчальныя расейскія нашэсьці на нашую краіну. Беларусь пацярпела велізарныя страты ў культуры, тэрыторыі, эканоміцы і людзкіх рэсурсах. Былі спаленыя тысячы беларускіх кніг, разбураныя старажытныя гарады і тысячы помнікаў беларускай архітэктуры, зьнішчана беларуская школа і царква, забаронена беларуская мова.

Прадуманае вынішчэньне беларусаў і стварэньне штучных умоваў для памяншэньня насельніцтва прывялі да таго, што цягам стагоддзяў беларускае насельніцтва амаль не павялічылася, хоць пры нармальным разьвіцьці на канец ХХ-га стагоддзя колькасьць беларусаў у Рэспубліцы Беларусь павінна было б складаць у сярэднім 40 мільёнаў чалавек. (Улічым, што ў выніку генацыду беларускае насельніцтва на працягу ХХ-га стагоддзя не павялічылася: каля 14 мільёнаў – у пачатку ХХ-га стагоддзя і 10 мільёнаў – у пачатку ХХІ-га).

Асабліва вынішчальнай для Беларусі была палітыка камуністычнай Расеі ў ХХ-м стагоддзі. У выніку генацыду, рэпрэсіяў і тэрору бальшавікі забілі каля трох мільёнаў беларусаў. Прытым, калі ў Расеі бальшавікі (што кіравалі Расеяй) праводзілі *палітычны тэрор*, то на Беларусі яны тварылі *генацыд.* Беларусь ня мела сувэрэнітэту, не была незалежнай краінай. Забойствы рабіла тут чужая адміністрацыя, якая выконвала рускую палітыку зьнішчэньня ўсяго беларускага. Зьнішчэньне ўсяго беларускага ўмацавала рускую акупацыйную ўладу і рускую каляніяльную палітыку ў Беларусі.

Расея ў выніку ўнутранага *палітычнага тэрору* не перастала быць рускай (нікога там не забівалі за рускую мову і рускую нацыянальную ідэю). Расейскія акупанты гвалтоўна спынілі працэс нацыянальнага Адраджэньня і рух беларускага народа да незалежнасьці.

Аналягічная схема вынішчэньня, толькі з абмежаваным ужываньнем уладнага тэрору, стасуецца цяпер у дзеяньнях кантраляванага Масквой рэжыму на Беларусі.

Выкарыстоўваюцца небясьпечныя ўмовы, якія ўтварыліся пасьля Чарнобыльскай катастрофы. Каляніяльная адміністрацыя цяпер (гэтак жа, як некалі ў БССР) праводзіць палітыку прыхаваньня наступстваў Чарнобыльскай бяды, замест іх ліквідацыі, што спрыяе разгортваньню дэмаграфічнай катастрофы на Беларусі. Спыненыя даплаты, праграмы дапамогі і падтрымкі насельніцтва лекамі, вітамінамі і чыстым харчаваньнем. На 2001 год у раёнах Гомельшчыны сьмяротнасьць у 2-3 разы перавысіла нараджальнасьць, а адмоўны прырост насельніцтва (дакладней, выміраньне) складае 10-15 чалавек на тысячу.

У 1986-1987 гадах, адразу пасьля Чарнобыльскага выбуху, прыхаваны генацыд савецкіх уладаў выяўляўся ў жорсткім адміністрацыйным медыцынскім узьдзеяньні на цяжарных беларускіх жанчынаў з патрабаваньнем пазбаўляцца ад плоду, каб не нарадзіць, маўляў, непаўнацэннага дзіцяці. Такая рызыка сапраўды была ў той час, але моцна перабольшаная палітадміністратарамі ад савецкай медыцыны. Гэта не падстава, каб без дасьледваньняў і вывучэньня кожнага выпадку цяжарнасьці пусьціць „пад нож” цэлае пакаленьне беларусаў. А менавіта гэта было зроблена.

Гэткая палітыка прадаўжаецца па сёньняшні дзень і набыла ва ўмовах антыбеларускага рэжыму выраблены кшталт. ***Сёньня з кожных трох зачатых плодаў беларусаў два забіваюць у жываце маці!!!*** Гэта небывалы ў сьвеце ганебны факт.

Устаноўлена, што ў асобных раёнах Беларусі пад выглядам чарнобыльскай небясьпекі ўльтыматыўна праводзяць стэрылізацыю жанчынаў. Прыклад: у 2000 годзе ў жаночай кансультацыі горада Барысава загадчыца гінекалягічнага аддзяленьня паведаміла, што іхняя „кансультацыя” ***праводзіць стэрылізацыю шматдзетных маці,*** каб пазьбегнуць, маўляў, нараджэньня хворых дзяцей і павелічэньня „асацыяльных” сем'яў. Яна спаслалася, што такі „парадак” стэрылізацыі вызначае Пастанова Савету Міністаў БССР, прынятая летам 1991 года.

Ніякага змаганьня з наступствамі чарнобыльскага выбуху (70% радыёактыўнага рэчыва выпала на тэрыторыю Беларусі) антыбеларускім рэжымам не праводзіцца. Наадварот, беларускую *трагедыю Чарнобыля знарок расьцягваюць у часе, каб скарыстаць вынікі атамнай катастрофы дзеля генацыду беларускага насельніцтва*. Тых беларусаў і тых вучоных, што супрацiўляюцца вынішчэньню, жорстка перасьледуюць (лёс прафэсара Бандажэўскага).

Аналіз статыстычных дасьледваньняў паказвае, што ў сярэднетэрміновай пэрспэктыве насельніцтва Гомельшчыны паменшыцца ўдвая. Але гэтакае становішча магчымае толькі ў тым выпадку, калі ўжо цяпер удасца спыніць рост сьмяротнасьці і зьніжэньня нараджальнасьці. Калі ж стабілізацыя паказчыкаў не адбудзецца, то можна чакаць поўнага выміраньня палешукоў.

Паказальна, што стварыўшы ўмовы для выміраньня беларускага насельніцтва, антыбеларускі рэжым спрабуе схаваць дэмаграфічную статыстыку, ажыцьцяўляючы чарговы этап генацыду, менавіта: замены выселенага і вымерлага карэннага беларускага насельніцтва прышлым, расейскім. Прытым робіцца гэта па выпрацаваных ужо здаўна імпэрскіх правілах захопу земляў. Вычышчаныя ад мясцовых людзей землі засяляюцца наперш рускім крымінальным элемэнтам (гэтак захоплівалі Паўночны Каўказ, Сібір, Алтай і г.д.). На пакінутыя землі беларускага Палесься перасяляюць тысячы бежанцаў, „бамжоў”, беглых крымінальнікаў з Расеі і былога СССР.

На сумежнай Берасьцейшчыне таемна будуюць сьмецьцесховішча для радыёактыўных адходаў з Эўропы і Расеі.

У чарнобыльскай сытуацыі прамаскоўскі акупацыйны рэжым на Беларусі дзейнічае па схеме фізічнага вынішчэньня беларускага народу.

Для беларусаў Чарнобыльская навала па сваіх дэмаграфічных наступствах значна пераўзыходзіць Другую сусьветную вайну, калі загінуў амаль кожны трэці беларус. Цяпер на Беларусі ідзе вялікая Чарнобыльская вайна. Стаўка тых, хто яе вядзе, — фізічнае зьнішчэньне беларускага народа.

* * *

Плянэтарная цывілізацыя, і найперш – краіны індустрыяльнага грамадзтва (да якога належыць і Беларусь) – уваходзяць у такую фазу ўзаемадачыненьняў і разьвіцьця, калі жыцьцяздольнасьць кожнага народу, кожнай нацыі, дзяржавы, як і ўсяго чалавецтва, вызначаецца па іх інтэлектуальным патэнцыяле, а не па колькасьці выплаўленага мэталу, здабытай нафты, газу ці іншых вытворчых рэсурсных паказьнікаў.

На Беларусі мэтанакіравана створаны надзвычай неспрыяльныя ўмовы для выхаваньня і функцыянаваньня інтэлекту. (Зарплата доктара навук, прафэсара бывае роўнай зарплаце сяржанта міліцыі). Краіна масава траціць інтэлігентных людзей, абучаную моладзь, спэцыялістаў, якія выязджаюць за мяжу і за бясцэн прадаюць свае веды. Прытым краіны, куды выязджаюць адукаваныя беларусы, атрымліваюць выгаду – спэцыялістаў, на навучаньне якіх яны не патрацілі ні граша і плацяць ім за раўназначную працу ў некалькі разоў менш, чым сваім грамадзянам. 80% беларускай моладзі заяўляюць, што жадаюць выехаць за межы Беларусі.

*Страта нацыянальнага інтэлекту – гэта ў цяперашніх умовах страта народнай пэрспэктывы, апушчэньне ў беднасьць, крок да „трэцяга сьвету” і далейшага выміраньня.*

На Беларусі скрыжаваліся два працэсы палітычнага імпэрыялізму. З аднаго боку, Расея, імкнучыся далучыць тэрытарыяльныя і людзкія рэсурсы нашай краіны, традыцыйна вядзе сваю зьнішчальную справу. З

другога боку, палітыка „адкрытага грамадзтва” Захаду, выцягваньне нашых інтэлектуальных рэсурсаў спрыяе адтоку беларускага інтэлекту на Захад.

Гэта зьнешнія формы стратаў. Але ***найбольш небясьпечнай і разбуральнай зьявай для інтэлекту беларускай нацыі ёсьць русіфікацыя*** (як складовая частка этнацыду), асабліва русіфікацыя школы і ў цэлым – адукацыі. Беларуская нацыя назапасіла вялікі станоўчы генэтычны інтэлектуальны патэнцыял за стагоддзі разьвіцьця ў сістэме эўрапейскай цывілізацыі. Менавіта праз беларускую мову прачытваецца генетычная памяць беларусаў. Таму непрыяцелі беларускай незалежнасьці імкнуцца задушыць генетычную памяць беларусаў праз русіфікацыю. Бяз доступу да генетычнай памяці беларус становіцца кволай, падзалежнай, нястойкай асобай.

* * *

Спыніць вынішчэньне беларусаў можна толькі пры адной умове: калі спыніць вынішчальную палітыку Расеі, адмежавацца ад гэтай краіны, умацаваўшы нашу незалежнасьць, межы, дзяржаву, культуру, нашае беларускае войска, беларускія грошы, вытворчасьць, сельскую гаспадарку ды эканоміку.

Гэта ёсьць найгалоўнейшае пытаньне: як спыніць расейскую палітыку вынішчэньня на Беларусі. Падзеі апошніх гадоў выразна паказалі, што адхіленьне ад улады Лукашэнкі яшчэ ня ёсьць гарантыя рэальных пераменаў. А калі Масква здолее правесьці на вяршыню беларускай улады свайго чарговага (нібы дэмакратычнага) стаўленіка, то вынішчэньне Беларусі толькі паскорыцца.

Ёсьць толькі адна ўмова выратаваньня Бацькаўшчыны. Змагацца!

Мы заклікаем беларусаў, мужчынаў і жанчынаў, моладзь і старэйшых людзей супраціўляцца зьнішчэньню, русіфікацыі , этнацыду. Нельга цярпець, каб нам плявалі ў твар, тапталі ў гразь нашае імя, зьневажалі наш гонар і мову, забіралі маёмасьць. Беларус ня мусіць быць бедным, бо ён працуе і мае Бацькаўшчыну. Хто забірае нашу працу? Куды яна дзяецца?

Каб змагацца – трэба быць разам. ***Аб’яднаць беларусаў можа толькі Беларуская нацыянальная ідэя.*** *А гэта ёсьць ідэя нашага вольнага нацыянальнага жыцьця ў незалежнай беларускай дзяржаве.* Беларусаў ня можа злучыць чужая ідэя ці чужая дэмакратыя, а толькі разлучыць. Вось чаму за сваю ідэю трэба змагацца супраць чужароднага.

Мы заклікаем вольныя краіны, якія дэкляруюць дэмакратыю і правы чалавека, падтрымаць нашу незалежнасьць і нашае змаганьне за жыцьцё і свабоду Бацькаўшчыны. Незалежная Беларусь – гэта павелічэньне вольнага сьвету, гэта ёсьць павелічэньне Эўропы.

Беларусь гістарычна, у выніку свайго геапалітычнага становішча ўзяла на свае плечы абарону Эўропы ад варвараў, і гэта падарвала яе сілы. Але трагедыя, здрада і несправядлівасьць XVIII стагоддзя, калі была падзеленая Рэч Паспалітая і Беларусь (***якая была суверэннай часткай гэтай канфэдэрацыі***) запрададзена пад Расею, не павінны больш паўтарыцца.

# „ІНТЭЛЕКТУАЛЬНЫ СЛУП”

Па вуліцах Менска, як вынікае з друку, часта бадзяецца шмат усялякіх паліттурыстаў з задворкаў Эўропы. Ім хочацца, відаць, сцьвердзіць тут сваю важнасьць, якой не дабралі ў сябе на бацькаўшчыне. Беларусы ўжо добра ведаюць такіх „мюлеманаў”. Тупізм гэтых паноў цалкам асаблівай якасьці.

Ня так даўно па Менску хадзіў нейкі Альфрэд Гросэр, якога напаткала спадарыня зь „Белорусской деловой газеты” (як удаюць, „незалежнай” і, як вядома, — рускай). Вынікам размовы з іншаземцам было інтэрв’ю ў памянёнай газэце пад рубрыкай „Пэрсона”. І называлася інтэрв’ю „Чалавек-Эўропа Альфрэд Гросэр”.*

„Імя прафэсара Гросэра наўрад ці што-небудзь кажа нашаму чалавеку, — слушна канстатуе газэта. — Між тым у Заходняй Эўропе Альфрэда Гросэра называюць ня больш ня менш як „вялікім натхняльнікам стварэньня адзінай Эўропы”, „духоўным і інтэлектуальным стаўпом” (слупом), „увасабленьнем эўрапейскай культуры” і г.д., „трудна перэчысьліць”, — піша газэта.

Бывае, чаго толькі не бывае. А „як вы ацэньваеце ўзровень узаемадачыненьняў паміж Францыяй і Беларусьсю?” — задае гэтакае дасьціпнае пытаньне „пэрсоне” дзелавая газэта.

„У Каліфорніі мяне часта пыталі: „Што вы думаеце пра адносіны Францыі і Каліфорніі?”. Я адказваў: „Нічога. Я пра іх ня думаю”, — адказвае інтэлектуальная „пэрсона”. І далей працягвае гэтак глыбокадумна. — Бальшыня французаў мае даволі цьмянае ўяўленьне пра Беларусь... Мы дрэнна ўяўляем сабе ў аб’яднанай Эўропе такія сталіцы, як Сафія, Прага, Будапэшт і гэтак далей.”

Ух ты! Вось гэта вучонасьць. Эўропа! Адразу відаць, што галава ў гэтага Альфрэда да рэшты перапоўненая вучонасьцю. Пад цяжарам ведаў на бок хіліцца і Прагу з Будапэштам ужо ніяк ня ўмесьціць. Няма месца.

Неяк яшчэ ў маладосьці прачытаў я ў расейскім часопісе „Вокруг света” нататкі аднаго французкага аматара падарожжаў. У 1960-х трапіў гэты падарожнік аж у Гімалаі, ці то ў Сікім, ці то ў Бутан (ня памятаю). І наладзілі яму прыём у караля княства. Па палацы хадзілі куры, і кароль спытаў экзота, адкуль ён.

— З Францыі, — адказвае француз.

Кароль падумаў і спытаў яшчэ:

— Францыя, гэта дзе: на захад ад Лхасы, ці на ўсход?

— На захад, — правільна адказаў француз.

Больш пытаньняў не было. Для гімалайскага караля Францыя — нішто, пусты гук. Ён пра яе нічога ня ведаў.

Тым часам „інтэлектуальны слуп” і „натхняльнік адзінай Эўропы”, безумоўна, павінен добра ведаць Прагу і Будапэшт, пэўна, ня раз там быў, можа нават зайздросна захапляўся, можа нават чытаў Гашэка і Пёцефі. Але яму хочацца ўдаваць з сябе вышэйшага за ўсё гэта, паказаць, што ён важнейшы (маўляў, „мы из Адесы”), што ён з цэнтра сьвету („мы ... ў аб’яднанай Эўропе...”).

Кожны псіхоляг скажа, што такое захаваньне ёсьць праяўленьне комплексу непаўнавартаснасьці, таемнае зайздрасьці і ўражанага правінцыялізму. А вось адкуль гэта ў гросэраў з Францыі ды Парыжу — пытаньне для разваг. Можа таму, што Парыж даўно ўжо ня той Парыж, хоць гросэры і ня могуць з тым зьмірыцца.

Мне казалі, што ў Францыі існуе яшчэ шмат асобаў, якія перакананыя, што ўвесь сьвет гаворыць на французкай мове.

У канцы інтэрв’ю апавядальнік з Парыжу выказаўся яшчэ пра глябалізацыю.

„Вернемся да глябалізацыі. Дарэчы, менавіта ў Францыі яе называюць „амэрыканізацыяй”. Гэта адно і тое?” — гэтак ліха („á пропó”) задае спадарыня пытаньне стаўпу адзінай Эўропы.

„Калі каму падабаецца „Мак Дональдс” і яго незразумела якое мяса, то хай есьць. Вось і ўсё”, — ня менш ліха расправіўся з глябалізацыяй „чалавек-Эўропа” — „дасьціпны” мсьё Гросар.

У беларусаў не было і няма, як у расейцаў, „нізкапаклонства перад Захадам”. Беларус добра адрозьнівае розум ад дурноты, незалежна адкуль яна прыехала і якімі тытуламі абвешаная. Але гросэры, якія блытаюць Беларусь з Каліфорніяй, гэтага ўявіць ня могуць. Яны едуць да нас псіхічна самасцьвярджацца, ім хочацца беларусаў павучаць і адчуць тут сваю вычарпаную і сумніўную веліч.

Беларусы спатыкаюць іх са шчырым сэрцам. Мне нават прыходзілася бачыць і ўдзельнічаць у мерапрыемствах, калі зграя гросэраў „на халяву” так надзіраліся беларускай самагонкі (як ні дзіўна), што цалкам гублялі чалавечы воблік (да „сініх чарцей”).

Пасьля гэтага гросары вярталіся ў аб’яднаную Эўропу і пісалі нешта накшталт, як у нашага „стаўпа”, што маюць пра Беларусь „цьмянае ўяўленьне”.

Трэба разумець, што гросары ёсьць закамплексаваныя людзі. Яны будуць так пісаць пра Беларусь вечна і вечна будуць нічога пра яе ня ведаць. Гэтак

жа, як нічога ня будуць ведаць пра Прагу, Будапэшт, Яна Гуса, — пра ўсё, што па за межамі іхняга абмежаванага самалюбаваньня і параненага самалюбства. Ім так хочацца. Гэта асаблівая заходняя мэнтальнасьць, выяўленая Зыгмундам Фройдам. І нядзіўна, што Фройд са сваімі хворымі збачэнскімі ўяўленьнямі зьвіўся менавіта на Захадзе. Ён адлюстраваў псіхічнае асяроддзе, „заходнія думкі" заходняй індывідуальнасьці.

Фройды ня могуць узьнікаць на Беларусі і ўвогуле — ва Ўсходняй Эўропе. Ад гросэраў няма ніякай карысьці для Беларусі, акрамя шкоды.

Але ня думайма, што гэта ўсяго толькі састарэлы Хлестакоў заблукаў на менскія вуліцы. І тым больш ня думайма, што гэты арыгінал прыехаў да нас як сябра Беларусі.

„Мы ў чаканьні **якіх бы там ні было аб'яднаўчых працэсаў на постсавецкай прасторы,** — выпальвае раптам „вялікі натхняльнік", — вядома, ня лічачы прыбалтыйскіх рэспублік. **Ня важна, на якой аснове будзе адбывацца аб'яднаньне, галоўнае, каб яно адбывалася**".

**„Калі мы думаем пра Расею,** — разьвівае далей палёт думкі „пэрсона", — **пытаньне, якое адразу паўстае: ці зьбіраецца Расея пашырацца да польскай мяжы?"**

Тут самы раз было б паказаць „стратэгу" на дзьверы, але, відаць, не для гэтага яго запрасілі ў Беларусь. Госьць з Парыжу (які зьяўляецца звычайным лабістам пэўных колаў) адлюстраваў тыя думкі, якія хацелі б чуць імпэрскія палітычныя стратэгі з „восі" Масквы, Парыжу і Бэрліну.

Але на працягу апошніх больш чым 200 гадоў эўрапейскай гісторыі тварэньне розных „восяў" з удзелам гэтых сталіцаў ні да чаго добрага не прыводзіла. У грубых плянах падзелу Эўропы на дзьве супэрімпэрыі (Расея і Эўразьвяз) не пакінута ў будучыні месца ні Беларусі, ні Ўкраіне. Цяпер жа па нашых абшарах пад выглядам дабрадзеяў для „дэмакратыі" бадзяюцца ўсялякія палітычныя маніпулятары, гаваруны з Заходняй Эўропы, экстраваганты-эксцэнтрыкі, лабісты, разьведчыкі ў адстаўцы, вікі ды шульцы, цапфы ды рывальe, і кожны робіць сваю чорную справу.

***Вельмі істотна беларусам цяпер адрозьніваць зерне ад кукольля — сапраўдных інтэлектуалаў з Захаду, прыхільнікаў і сяброў Беларусі ад шкоднікаў і „гастралёраў". А крытэрый вельмі просты: нармальны чалавек і прыхільнік Беларусі ніколі ня скажа пра „цьмянае ўяўленьне", ня будзе дакучліва выстаўляць напаказ сваё няведаньне і выхваляцца дурнотай. Наадварот, ён засьведчыць павагу да нашага краю, да беларускай мовы і гісторыі, выявіць веданьне нашай культуры, якая ёсьць культурай вялікай і эўрапейскай.***

***Адам МІКША***

* БДГ, — 2001, 19 сьнежня

# МЕНСК. ПАВЕДАМЛЕНЬНІ З ФРОНТУ

*30 ліпеня* антыбеларускія ўлады пайшлі на чарговую правакацыю ў Курапатах, імкнучыся нанесьці шкоду Народнаму Мэмарыялу памяці ахвяраў расейска-бальшавіцкага тэрору. А $16^{00}$ на пляцоўку перад Крыжом Пакутаў заехала грузавая машына вялікіх памераў, загружаная жалеза-бэтоннымі плітамі. Рабочыя пачалі ськідваць пліты на зямлю якраз у тым месцы, дзе на мінулым тыдні бульдозер раскапаў канаву для ўкладкі трубаў з мэтай зьнішчэньня курапацкіх магілаў сточнымі водамі. (Сябры Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ тады абаранілі сьвятыню і засыпалі канаву.) Але рабочыя пасьпелі сьскінуць толькі шэсьць плітаў. Сябра Кансэрватыўна-Хрысьціянскай партыі — БНФ ***Уладзімер Юхо*** ўстаў перад машынай і прымусіў выканальнікаў варварскага загаду пакінуць тэрыторыю Народнага Мэмарыялу.

*1 жніўня* Сябры Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ зноў сабраліся каля помніка ***Янку Купалу*** ў сталіцы на традыцыйныя Купалаўскія чытаньні. Дэклямавалі вершы і фрагмэнты прозы Купалы, гаварылі аб жыцьці і творчасьці беларускага генія.

*3 жніўня* Сябры Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ прышлі ў Курапаты на традыцыйную штосуботнюю талаку. Прыбралі тэрыторыю Народнага Мэмарыялу, выдалілі з-пад Крыжа Пакуты пліты, кінутыя рабочымі-дарожнікамі. Рыхтавалі месцы для наступных крыжоў. Штодня сябры Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ арганізоўваюць ахову Курапацкай сьвятыні.

*8 жніўня* антыбеларускія ўлады зноў спрабавалі ўварвацца на тэрыторыю Народнага Мэмарыялу памяці ахвяраў расейска-бальшавіцкага тэрору ў Курапатах. Каля $14^{00}$ на тэрыторыю Мэмарыялу (на пляцоўку перад Крыжом Пакутаў) спрабавалі ўехаць будаўнічыя краны. Зьявіліся рабочыя, інжэнеры, афіцэры міліцыі і КГБ. Сябра Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ ***Уладзімер Юхо*** стаў на шляху тэхнікі і не пусьціў разбуральнікаў на тэрыторыю сьвятыні. Афіцыйныя асобы адмовіліся камэнтаваць дзеяньні і свае далейшыя пляны. У Курапатах пачалі зьбірацца сябры Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ, каб абараніць магілы і крыжы. Яны працягвалі варту.

*8 жніўня* сябры Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ зноў сабраліся на традыцыйныя штočацьвярговыя паэтычныя чытаньні каля помніка ***Янку Купалу*** ў сталіцы.

*10 жніўня* сябры Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ сабраліся ў Курапатах на традыцыйную талаку. Прыбралі магілы, ачышчалі тэрыторыю Народнага Мэмарыялу ад сьмецьця.

*11 жніўня* група сяброў Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ (прадстаўнікі Менска, Баранавічаў, Ліды, Лунна, Слоніма) прыехалі ў Зэльву, каб адзначыць Дзень памяці ***Ларысы Геніюш***. Старшыня Зэльвенскай суполкі Партыі ***Юры Качук*** быў галоўным арганізатарам мэмарыяльнага мерапрыемства, на якое сабраліся дзясяткі людзей з усяе Гарадзеншчыны. У мясцовай царкве прайшла памінальная багаслужба. Потым людзі пайшлі на могілкі. Каля магілы *Ларысы* і *Янкі Геніюшаў* адбыўся мэмарыяльны мітынг пад *Бел-Чырвона-Белымі сьцягамі.* Дэклямавалі вершы паэткі, гаварылі пра яе неўміручую творчасьць і гераічнае жыцьцё. Прагучалі ўспаміны сваякоў і сяброў Геніюшаў.

*13 жніўня.* Сябры Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ прыйшлі на Вайсковыя могілкі сталіцы, каб адзначыць Дзень памяці вялікага беларускага паэта ***Якуба Коласа***. Каля надмагільнага помніка Песьняру сабралася больш за 30 сяброў зь *Бел-Чырвона-Белымі сьцягамі.* Мэмарыяльны мітынг адкрыў спадар ***Міхась Міцкевіч***, сын *Якуба Коласа*.

*15 жніўня* ў *сквэры Янкі Купалы* ў сталіцы зноў сабраліся сябры БНФ на традыцыйныя Купалаўскія літаратурныя чытаньні. Дэклямавалі вершы і сьпявалі беларускія песьні.

*17 жніўня* сябры Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ сабраліся ў Курапатах на традыцыйную штосуботнюю талаку. Прыбіралі тэрыторыю Народнага Мэмарыялу, высякалі сухі хмызьняк, выносілі сьмецьце, пакінутае вандаламі.

*22 жніўня* а $10^{30}$ антыбеларускія ўлады распачалі чарговую правакацыю з мэтай зьнішчэньня Народнага Мэмарыялу ў Курапатах. На тэрыторыю Курапатаў прыбылі на машынах больш за 10 рабочых з піламі з намерам высякаць дрэвы на тэрыторыі нацыянальнай сьвятыні. У Курапаты тут жа прыбылі сябры Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ і спынілі варварскую акцыю.

*24 жніўня* сябры Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ правялі ў Курапатах традыцыйную штосуботнюю талаку. Даглядалі магілы, напраўлялі пашкоджаныя вандаламі крыжы, ачышчалі тэрыторыю.

*25 жніўня.* Сябры Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ прыйшлі да помніка ***Якубу Коласу*** ў цэнтры беларускай сталіцы, каб распачаць праграму паэтычных чытаньняў, прысьвечаных 120-м угодкам Вялікага Песьняра. Трымалі ў руках *Бел-Чырвона-Белыя сьцягі* і транспарант ***„Жыве Беларусь!"***. Паэтычныя чытаньні распачаліся сьпяваньнем гімну ***„Магутны Божа"*** і ўскладаньнем кветак да помніка. Потым людзі дэклямавалі вершы, гаварылі пра неўміручасьць творчасьці паэта. Успаміналі, што роўна 11 гадоў таму, 25 жніўня 1991 года, намаганьнямі *дэпутатаў Апазыцыі Беларускага Народнага Фронту*

*„Адраджэньне” пад кіраўніцтвам спадара Зянона Пазьняка* быў нададзены статус Канстытуцыйнага акту Дэкларацыі аб суверэнітэце Беларусі.

Неўзабаве зьявіліся тры міліцэйскія машыны і каля 20 міліцыянтаў і амонаўцаў. Міліцыянты запатрабавалі разысьціся. Прысутныя адказалі, што маюць права чытаць вершы Якуба Коласа на сваёй беларускай зямлі. Тады па загаду палкоўніка міліцыянты накінуліся на людзей і груба пацягнулі ў міліцэйскія „крумкачы”. Але некалькіх затрыманых удалося вырваць з рук лукашысцкай паліцэйшчыны. Калі сябра Сойму Фронту і Партыі спадарыню ***Вольгу Кацянкову*** (пэнсіянэрка) груба цягнулі ў машыну, міліцыянты выкруцілі і пашкодзілі ёй руку. Спадарыня Кацянкова вымушаная была зьвярнуцца па медычную дапамогу.

Затрымалі ***Юры Беленькага***, ***Анатоля Крыварота***, ***Уладзімера Таралу*** (міліцыянты пашкодзілі яму руку), ***Канстанціна Нямковіча***, ***Уладзімера Ладуцьку***, ***Уладзімера Юхо***, ***Барыса Мускага***.

*31 жніўня* сябры Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ зноў сабраліся ў Курапатах на традыцыйную штосуботнюю талаку. Прыбіралі магілы, добраўпарадкавалі тэрыторыю Народнага Мэмарыялу, вытурвалі са сьвятога месца алькаголікаў і вандалаў.

*1 верасьня* сябры Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ прышлі да помніка ***Якубу Коласу*** ў сталіцы. Убачыўшы людзей пад *Бел-Чырвона-Белымі сьцягамі*, міліцэйскія афіцэры (тыя самыя, што выкручвалі рукі і затрымлівалі фронтаўцаў тыдзень таму, 25 жніўня, на пл. Якуба Коласа) падбеглі і пачалі „запрешчать і не пушчать”. Але людзі спакойна ўсклалі да помніка Коласу кветкі, прасьпявалі *„Магутны Божа”* і накіраваліся ў сквер ***Янкі Купалы***. Там, каля помніка Купалу, пад *Бел-Чырвона-Белымі сьцягамі* адбыліся літаратурныя чытаньні, каторыя вяла сябра Партыі кандыдат мовазнаўства ***Валянціна Мароз***. Галоўным выступоўцам быў 6-гадовы ***Лёша Кашэль***, які сёлета пайшоў у беларускую школу (захаваную, дзякуючы намаганьням ягонай сям'і, якая мабілізавала беларусаў на супраціў русіфікацыі). Скора заўважылі кагэбіста з п'янай фізіяноміяй. Той ледзь трымаўся на нагах, але нахабна лез і здымаў людзей на відэакамэру. Давялося здаваць яго міліцэйскаму патрулю. Менчукі далучыліся да чытаньняў.

*У ноч на 4 верасьня* невядомыя злачынцы зьдзейснілі акт вандалізму ў Курапатах. На тэрыторыі Народнага Мэмарыялу былі пашкоджаныя два крыжы і зьнішчаныя тры крыжы. Вандалы пашкодзілі таксама частку рытуальнага афармленьня Крыжа Пакутаў у Курапатах. Антыбеларускі рэжым надалей спрыяе актам вандалізму.

*7 верасьня* сябры Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ правялі штосуботнюю талаку ў Курапатах. Даглядалі магілы, прыбіралі тэрыторыю Народнага Мэмарыялу.

*8 верасьня* сябры Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ (Партыі БНФ) урачыста адзначылі ***Дзень Беларускай Вайсковай Славы*** — адно з найважнейшых нацыянальных сьвятаў. У цэнтры Менска каля помніка Якубу Коласу а $12^{00}$ сабраліся дэманстранты пад *Бел-Чырвона-Белымі нацыянальнымі сьцягамі*, усклалі кветкі да помніка песьняру і прасьпявалі гімн ***„Магутны Божа”***. Потым прайшлі па праспэкце Францішка Скарыны да цэнтральнага будынка Акадэміі Навук, дзе пачаліся сьвяточныя выступы. Выступілі спадары ***Юры Беленькі***, ***Сяргей Папкоў***, *унук Якуба Коласа спадар* ***Кастусь Міцкевіч*** (сябра Партыі), а таксама іншыя выступоўцы. Быў зачытаны зварот спадара *Зянона Пазьняка* — старшыні Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне” і Партыі БНФ — *„Жыве Беларусь і будзе жыць!”*. Нягледзячы на пастаянныя спробы міліцыі перашкодзіць мерапрыемству, сьвяткаваньне прайшло пад знакам аптымізму і беларускай салідарнасьці.



**120-я ўгодкі Янкі Купалы (Менск)**

*12 верасьня* сябры Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ прышлі да помніка *Янку Купалу* ў Менску, на традыцыйныя шточацьвярговыя паэтычныя чытаньні, прысьвечаныя 120-годдзю ***Янкі Купалы*** і ***Якуба Коласа***.

*14 верасня* ў Менску адбыўся Сойм Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне” і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ. Быў заслуханы даклад спадара *Зянона Пазьняка*, абмеркаваныя пытаньні аб захадах па абароне ад расейскай агрэсіі.

*14 верасьня* сябры Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ правялі ў Курапатах традыцыйную штосуботнюю талаку. Група сяброў Партыі з г. Жодзіна прывезла вялікі крыж у памяць ахвяраў расейска-бальшавіцкага тэрору і ўстанавіла яго ў Курапатах.

*19 верасьня* сябры Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ усклалі кветкі да помніка *Якубу Коласу* ў Менску, а потым сабраліся на традыцыйныя штачацьвярговыя літаратурныя чытаньні каля помніка *Янкау Купалу*. Чытаньні адбываліся пад транспарантам з надпісам: ***„Ворагам Беларушчыны: Жыў беларус і будзе жыць!”*** У пэўны момант людзі заўважылі, як здалёк іх здымае фотакамэрай нейкая „таямнічая асоба”. Калі паспрабавалі наблізіцца да яе, каб спытацца, ад якой агенцыі фотарэпарцёр, то „асоба” кінулася на ўцёкі.

„Таптуны” з КГБ баяцца беларусаў, адданых паэзіі.

*20 верасьня* сёлета споўніўся роўна год з таго дня, як пачалася новая глава Курапацкай драмы: антыбеларускі рэжым Лукашэнкі распачаў разбурэньне сьвятыні нашага народу — магілаў ахвяраў расейскага тэрору і крыжоў у Курапатах. З таго памятнага дня і на працягу ўсяго года сябры Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ абаранялі ад зьнішчэньня Курапаты, паставілі больш за 300 крыжоў. Шмат нашых сяброў пацярпела ад рэпрэсіяў незаконнай улады. Але агульнымі намаганьнямі фронтаўцы дамагліся галоўнага — у Курапатах існуе і ствараецца Народны Мэмарыял памяці ахвяраў антыбеларускага генацыду.

*21 верасьня* сябры Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ, прышлі ў Курапаты на традыцыйную штосуботнюю талаку. Прыбіралі тэрыторыю Народнага Мэмарыялу, саджалі кветкі пад крыжамі. Вялікая група *польскай моладзі з Познані* (былі там і некалькі этнічных беларусаў) далучыліся да талакоўцаў. На тэрыторыі Мэмарыялу працавалі таксама *журналісты з Нарвегіі* і *тэлегрупа з Эстоніі*.

Мабыць, з гэтае прычыны назіралася нязвыклая актыўнасьць, ўзбуджанасьць і нэрвовасьць спэцслужбаў. Міліцэйскія чыны набліжаліся да людзей, пытаючыся, што яны тут робяць. На дарожным насыпе адна за адной пад'язджалі і ад'язджалі белыя і чорныя легкавікі з зацемненымі шыбамі. Адтуль выскоквалі і рассыпаліся сярод дрэваў кагэбісты, каб потым сачыць за працуючымі талакоўцамі і журналістамі.

Эстонскі рэжысёрківаў галавой і казаў, што ня думаў убачыць такое ў сучаснай Эўропе. Журналісты зьдзіўляліся, што ў нашай краіне дагэтуль няма аніводнага помніка ахвярам бальшавіцкага рэжыму, які паставіла б дзяржава.

*22 верасьня* сябры Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ прыехалі ў вёску Хаўхоліца (Барысаўскі раён), каб наведаць дзяцей у мясцовым прытулку. Яны перадалі дзецям акварэльныя фарбы, алоўкі ды іншыя пісьмовыя прыналежнасьці — падарунак ад добрых людзей з Італіі і Нарвэгіі. Пачаставалі таксама бананамі і апэльсінамі. Атрымалася невялічкае сьвята з гульнямі і песьнямі. Прыемна ўразіла нас прыгожая

беларуская мова, на якой размаўляюць дзеткі. Вялікі дзякуй сябрам беларускіх дзяцей ***Рабэрце Сільвіна***, ***Адрыяне Руэле*** і ***Карстэну Стэру***. Як і паўсюль па нашай краіне, большасьць гэтых дзяцей — сацыяльныя сіроты, бацькі якіх пазбаўленыя бацькоўскіх правоў.

*On September 22, 2002* the members of the Conservative Christian Party — BPF have visited the orphanage in Khaukholitsa (Barysau prov.). The major part of these children (like everywhere in Belarus) are social orphans — their parents have been deprived of their rights by the court. Party members have given to the children the water-colours, pencils, fruts and other gifts from the friends from Italy and Norway. Adults and children have made a real feast with songs and games. The children speak in a beautiful Belarusan language. Thanks very much the friends of the Belarusan children ***Mrs. Roberta Silvino***, ***Mrs. Ardriana Ruele*** and ***Mr. Karsten Staehr***.

*25 верасьня.* Рэжым не спыніў свае спробы зьнішчыць Курапаты — гэтае месца расейскага злачынства. Па загаду начальства група рабочых пачала раскопваць канаву ад зьліўной трубы з боку кальцавой дарогі ў напрамку Вялікага Крыжа Пакутаў з мэтай затапіць магілы (такія спробы рабіліся ў мінулым ужо ня раз).

На шляху рабочых сталі сябры Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ ***Уладзімер Юхо*** і ***Аліна Дуброўская***, да якіх далучыліся два маладых чалавекі. Учатырох ім удалося спыніць рабочую брыгаду і плынь вады, якую рабочыя выпампоўвалі з трубы.

*26 верасьня* сябры Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ зноў сабраліся каля помніка *Янку Купалу* ў Менску на традыцыйныя шточацьвярговыя літаратурныя чытаньні. Да чытальнікаў завіталі дзеці — група першаклясьнікаў зь беларускага кляса (які адстаялі ва ўмовах татальнай русіфікацыі бацькі дзетак) са сваёй настаўніцай. Дзеці выканалі праграму зь беларускіх вершаў і пантамімы. Сябры Партыі паднесьлі юным артыстам прызы — дзіцячыя кнігі беларускіх выдавецтваў. Чытала свае вершы 14-гадовая паэтка ***Ліза Панамарова***. Усіх уразіла шчырасьць яе твораў, прыгажосьць мовы. Прысутныя жартоўна прагаласавалі за тое, каб перадаць вершы Лізы ў рэдакцыю „Бярозкі".

*28 верасьня* сябры Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ прышлі ў Курапаты на традыцыйную штосуботнюю талаку. Больш за 50 асобаў ставілі крыжы над магіламі беларускіх пакутнікаў. На працягу дня было пастаўлена 60 крыжоў. Сярод іх таксама ватыўны крыж (крыж-прысьвячэньне) ад моладзі горада Познань (Польшча). Былі адноўленыя таксама два крыжы на Крыжовай алеі, пашкоджаныя варварамі. У выніку крыжаўзьвядзеньня афарміліся новыя зоны агульнай манумэнтальнай кампазыцыі Народнага Мэмарыялу.

Людзі прыбіралі тэрыторыю Мэмарыялу, саджалі каля крыжоў кветкі. Выканаўшы працу, усе сабраліся каля Вялікага Крыжа Пакутаў і праспявалі гімн *„Магутны Божа"*.

*29 верасьня* ў цэнтры Менска, каля помніка *Янку Купалу,* грамадзяне горада з удзелам прадстаўнікоў іншых гарадоў Беларусі правялі мітынг у абарону суверэнітэту і незалежнасьці Беларусі.

У сувязі з тым, што Менгарвыканкам не дазволіў праводзіць мітынг каля помніка *Янку Купалу* Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ, правядзеньне мітынгу ўсклалі на сябе арганізацыі *Беларускага Нацыянальна-Вызвольнага Руху* і *Менскі Камітэт па абароне ад расейскай агрэсіі.*

Удзельнікі мітынгу разгарнулі нацыянальныя *Бел-Чырвона-Белыя сьцягі* і транспаранты: ***„Ніякіх саюзаў з імпэрскай Расеяй!", „Расейскія ваенныя базы — прэч зь Беларусі!", „Беларуская Салідарнасьць — наш супраціў расейскай акупацыі"***.

Пад няспынным уціскам міліцыі, накіраванага на спыненьне мітынгу, удзельнікі мітынгу аднагалосна прынялі рэзалюцыю. Быў зачытаны зварот *Зянона Пазьняка,* Старшыні Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне" да беларусаў з заклікам: бараніць суверэнітэт і незалежнасьць Беларусі; ня ўдзельнічаць ў рэфэрэндумах і выбарах, арганізаваных лукашэнкаўскім рэжымам; ствараць паўсюдна ***Камітэты па абароне Беларусі ад расейскай агрэсіі***. Выступіў ***Юры Беленькі***, Выконваючы абавязкі старшыні Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне" на Беларусі з аналізам эканамічнай і інфармацыйнай вайны Расеі супраць Беларусі.

Ход падзеяў у пэрыяд падрыхтоўкі, а таксама падчас мітынгу і пасьля яго завяршэньня выявіў хлусьлівасьць Лукашэнкі і яго рэжыму, паказаў, што для іх суверэнітэт Беларусі ёсьць фразэалёгія, інфармацыйная заслона іхняй здрадніцкай палітыкі на карысьць Расеі.

Пасьля завяршэньня мітынгу, калі ўдзельнікі выйшлі на прылягаючыя вуліцы і праспэкт Францішка Скарыны, па міліцэйскіх рацыях была дадзена каманда на арышты актывістаў мітынгу. „Спэцназ" пры дапамозе „спэцоў" у цывільным, якія па рацыях каардынавалі іхную дзейнасьць, гвалтоўна напаў на актывістаў. У выніку нападу арыштаваныя: ***Юры Беленькі*** (Выконваючы абавязкі старшыні Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне"), ***Валеры Буйвал*** (сакратар Управы Сойму Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне"), ***Кастусь Кашэль*** (кіраўнік раённай арганізацыі Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне"), ***Уладзімер Плотнікаў*** і ***Здзіслаў Абрэмскі*** (сябры Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне").

Агульнае кіраўніцтва вайсковымі фармаваньнямі і міліцыяй, як было заўважана, выконваў **У**.**Навумаў** — міністар унутраных справаў лукашэнкаўскага рэжыму.

Барацьба беларускага грамадзтва супраць расейска-імпэрскай агрэсіі будзе пашырацца. Ня ўдасца ніякаму акупацыйнаму рэжыму спыніць гэтую барацьбу. Так заяўлялі адраджэнцы.

## *Вытрымкі з рэзалюцыі мітынгу 29 верасьня 2002 г.*

*Заявы расейскага кіраўніцтва 24 чэрвеня і 14 жніўня гэтага года аб плянах анэксіі нашай краіны ёсьць грубы акт палітычнай агрэсіі супраць Беларусі, адкрытае пасягненьне на суверэнітэт і незалежнасьць нашай дзяржавы, сьведчаць аб плянах і дзеяньнях інфармацыйнай, эканамічнай і палітычнай вайны Расеі супраць Беларусі, аб імкненьнях захапіць нашу жыцьцёвую прастору, тэрыторыю і нацыянальныя багацьці.*

*Такія пляны і дзеяньні Расеі груба парушаюць Гэльсінскія пагадненьні, міжнародныя акты і канвэнцыі аб мірным суіснаваньні краінаў, аб неагрэсіі і непарушнасьці межаў у Эўропе.*

*Мы прапануем палітычным арганізацыям Беларускага Вызвольнага Руху, усім беларускім грамадзкім арганізацыям Рэспублікі Беларусь і замежжа:*

*1. Зьвярнуцца ў міжнародныя арганізацыі, перш за ўсё ў ААН, АБСЭ, Эўрапейскі Зьвяз, Эўрапарлямант і ў Гаагскі Міжнародны Суд з патрабаваньнем аб* ***прызнаньні Расеі агрэсіўнай краінай****.*

*2. Зьвярнуцца ў міжнародны суд аб прызнаньні несапраўднай і няважнай дамовы аб саюзе Беларусі з Расеяй ад 8 сьнежня 1999 г. і іншых дамоваў, заключаных паміж нелегітымным рэжымам Лукашэнкі і агрэсіўным кіраўніцтвам Крамля.*

*Давесьці да ведама міжнародных арганізацыяў, што* ***беларусы не прызнаюць цяпер і не прызнаюць ніколі ніякіх дамоваў і „саюзаў" з Расеяй, заключаных нелегітымным рэжымам Лукашэнкі****.*

*3. Зьвярнуцца да беларускага грамадзтва з прапановай* ***ня ўдзельнічаць ні ў якіх выбарах і рэфэрэндумах, арганізаваных нелегітымным рэжымам Лукашэнкі****.*

*4. Падтрымаць паўсюднае стварэньне* ***Камітэтаў па Абароне Беларусі ад расейскай агрэсіі****.*

***Валеры БУЙВАЛ***

## САРОКА

*Генадзь Антонавіч (1947 – 27.09.2002)*

Пасьля доўгай, працяглай хваробы памёр наш дарагі сябра Генадзь Антонавіч Сарока. Ён нарадзіўся на Пружаншчыне ў сялянскай сям'і. Усё жыцьцё працаваў на зямлі: аграномам, потым старшынёй калгаса на Камянеччыне. Калі пачалася наша рэвалюцыя, Генадзь Антонавіч уступіў у

Беларускі Народны Фронт „Адраджэньне”, з 1989 г. узначальваў Раду БНФ Пружанскага раёна. Удзельнічаў у Першым Зьезьдзе Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне” у Вільні ў чэрвені 1989 г., уваходзіў у склад Берасьцейскай абласной Рады і быў сябрам Сойму БНФ „Адраджэньне”. У 90-я гады земляки абралі яго дэпутатам Пружанскага гарадзкога савета.

Генадзь Антонавіч быў сапраўдным патрыётам Бацькаўшчыны, душэўным, сьветлым чалавекам, якімі так багатая наша беларуская зямля. Сьветлая памяць аб ім назаўсёды захаваецца ў нашых сэрцах.

*Сябры Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне”*
*і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ*
*29 верасьня 2002 г.*

# ПРЭС-РЭЛІЗ

*(Паводле „Народнай Волі”, „Нашай Свабоды”, радыё „Свабода”і інш. 2001 г.)*

## *КАСТРЫЧНІК* (2001г.; працяг з №4(44)

■ Міністар фінансаў здаў лукашэнкаўскую „заначку”. Міністар фінансаў Беларусі Мікалай Корбут афіцыйна пацьвердзіў, што Лукашэнка хавае ў Беларусбанку грошы, атрыманыя ад продажу зброі. Па словах М. Корбута, сродкі, якія дзяржава атрымлівае ад рэалізацыі гэтак званых спэцматар’ялаў Міністэрства абароны — „танкаў і іншага ўзбраеньня” — трапляюць у Беларусбанк на рахункі „рэзэрвовага фонду прэзыдэнта” і „стабілізацыйнага фонду”. Міністар пацьвердзіў, што сродкі з гэтых фондаў не фігуруюць „ні ў якім артыкуле бюджэту”. Апошнія словы азначаюць, што Лукашэнка, фактычна, „прысабечыў” грошы, якія належаць народу Беларусі.

■ У Расеі цяпер пры ўладзе — піцерскія. А ў Беларусі пануе магілёўска-шклоўскі клан: сам Лукашэнка, прэм’ер Генадзь Навіцкі, віцэ-прэм’ер Аляксандар Папкоў, віцэ-сьпікер Уладзімер Канаплёў, міністар гандлю Аляксандар Кулічкоў, міністар сувязі Уладзімер Ганчарэнка, старшыня Беларусбанка Надзея Ермакова, старшыня ЦВК Лідзія Ярмошына... А былі яшчэ і экс-адміністратар Сініцын, экс-заўхоз Ціцянкоў, экс-тэледырэктар Кісель, экс-пракурор Бажэлка... Правіла дзейнічае ня толькі ў дачыненьні да асобаў. Але і да самога рэгіёну. Паводле бюджэту на 2002 год, па падатку на дадатковую вартасьць ад сабраных сродкаў Берасьцейская вобласьць атрымае 66%, Віцебская — 47%, Гомельская — 42%, Гарадзенская — 58%, Менская — 56%, Менск — 25%. А Магілёўшчына — ажно 91%.! Па падатках на даходы і прыбыткі юрыдычных асобаў Гомельская вобласьць атрымае 51,3%, сталіца — 33,3%, а Магілёўская — 100%.

■ Начальнік упраўленьня кадраў Мінабароны палкоўнік Аляксандар Цапота паведаміў БелПАН, што да 2006 г. Узброеныя Сілы Беларусі будуць скарочаныя на 18 тысячаў чалавек. У краіне, перапоўненай амонамі, спэцпадразьдзяленьнямі, міліцыяй, якія служаць рэжыму, застанецца 50 тысячаў жаўнераў і афіцэраў (сёньня ў нас — 83-тысячная армія), якія зьяўляюцца гарантам незалежнасьці і абаронцамі народу.

■ У Менску завяршыліся перамовы паміж расейскімі і беларускімі вайскоўцамі. Прадстаўнікі міністэрстваў абароны ўзгаднілі дакументы, якія прадугледжваюць утварэньне адзінай рэгіянальнай сістэмы супрацьпаветранай абароны Расеі і Беларусі (скарочана ЕРС). Та-ак, даўно беларусы не баранілі Маскву. Галоўны элемэнт дакумантаў — Пагадненьне пра сумесную ахову мяжы і паветранай прасторы „саюзнай” дзяржавы. Па сутнасьці, Масква і Менск у выпадку „зьнешняй агрэсіі” ўтвараюць кааліцыйную групоўку, у якую ўвойдуць, практычна, усе злучэньні і часткі, якія дыслакуюцца ва ўсходне-эўрапейскім рэгіёне. ЕРС будзе перададзена **ўся ўлада і адказнасьць у паветранай прасторы**.

■ Згодна з апошнімі дадзенымі Сусьветнага банку, Беларусь афіцыйна прылічана да бедных краінаў; грамадзяне нашай краіны ў сярэднім выдаткоўваюць штодня меней за адзін даляр ЗША. Мы цяпер у адной кампаніі з Аўганістанам, Інданэзіяй, Малдовай, Іракам...

■ Паліцэйскі ўхіл. „Палатка прадстаўнікоў нацыянальнага сходу” адобрыла ў першым чытаньні праект бюджэту на 2002 год. Вялізныя сродкі, як і ў папярэднія гады, прадугледжваюцца на ўтрыманьне распухлых сілавых структураў. На нацыянальную абарону выдзяляецца **235** мільярдаў рублёў, на праваахоўную дзейнасьць і гарантаваньне бясьпекі (КГБ і г.д.) — **368** мільярдаў, на судовую ўладу — **21,7** мільярда; у суме — **625** мільярдаў. У той жа час на прамысловасьць, энэргетыку будаўнічы комплекс — усяго **28** мільярдаў рублёў, а на культуру — **24** мільярды. Лічбы паказваюць, што ў нас працягваецца ўзмацненьне паліцэйскай дзяржавы. Упраўленьню справамі прэзыдэнта адпускаецца **45** мільярдаў рублёў, службе бясьпекі Лукашэнкі — **5** мільярдаў. А Нацыянальнай Акадэміі Навук — **6** мільярдаў. У дакуманце заплянаваныя непрапарцыйныя ўліваньні ў Магілёўскую вобласьць.

■ Рэспубліканскі інстытут анкалёгіі стаў першай медычнай установай, дзе лекарам забаранілі працу па сумяшчальніцтве і пасадзілі іх на голыя аклады. Тыя адразу падлічылі, што будуць губляць штомесяц ад 60 да 90 тысячаў рублёў, мэдсёстры — да 40 тысячаў.

■ На дадзены момант у швайцарскіх банках захоўваецца грошай на суму больш за 550 мільярдаў швайцарскіх франкаў, большая частка якіх трапляе з-за мяжы. Летась (згодна з данымі газэты „Файнэншнл Таймс”) найбольшы прырост сродкаў прыпаў на Гвінею, Баўгарыю, Бангладэж і Беларусь..! Як вядома, ананімнасьцю швайцарскай банкаўскай сістэмы карысталіся гітлераўскія нацысты, а пазьней шмат якія мафійныя структуры і дыктатарскія рэжымы.

■ Выбары скончыліся — пачаліся арышты. Лукашэнка пагнаў хвалю арыштаў чыноўнікаў. Начальнік Беларускай чыгункі Віктар Рахманько адхілены ад пасады. Супраць яго ўзбуджаная крымінальная справа, але ён „сэнатар”, прапанаваны ў палатку самім Лукашэнкам. Менш пашэнціла Леаніду Калугіну, кіраўніку аб’яднаньня „Атлант” па вытворчасьці халадзільнікаў. Лукашэнка паведаміў публіцы, што той знаходзіцца ў сьледчым ізалятары. Калугін выстаўляў сваю кандыдатуру на прэзыдэнцкіх выбарах. Лукашэнка дадаў, што „на чарзе яшчэ чалавек пятнаццаць”. Быў затрыманы міліцыяй таксама дырэктар стадыёну „Трактар” У. Алейнікаў — браў хабар з гандляроў, што працавалі на стадыёне. А кіраўнік сталічнай аўтаінспэкцыі Анатоль Сідарэня сам сышоў у адстаўку. Месцы для начальнікаў-расейцаў вызваляюцца.

## *ЛІСТАПАД* (2001 г.)

■ „Наша Свабода” паведаміла пра тое, што 30-40% кіраўніцкіх кадраў Гомельскай вобласьці не адпавядаюць патрабаваньням сучаснага гаспадараньня на зямлі. Пра гэта заявіў першы намесьнік старшыні мясцовага аблвыканкаму А.Бляяеў. „З 20 кіраўнікоў працуе толькі адзін”, — адзначыў начальнік. За апошнія тры гады на Гомельшчыне зьмянілася 80% кіраўнікоў гаспадарак. „Кіраўнікі згараюць...” — наракаў сп. Бляяеў. І патлумачыў, што „старшыня калгасу пачынае не з уздыму гаспадаркі, а з будаўніцтва свайго дома”. І вось на той жа старонцы газэты мы чытаем пад фанфары зацемку „Беларускія калгасьнікі вучацца ў Галяндыі”. Журналіст паведамляе, як „кіраўнікі сарака калгасаў і саўгасаў, аграпрамысловых прадпрыемстваў і гаспадарак Беларусі з усіх шасьці рэгіёнаў краіны з 19-га па 22-га лістапада знаходзіліся ў Каралеўстве Нідэрляндаў, дзе пад эгідай Беларускага саюзу калгасаў бралі ўдзел у сэмінары-вучобе”. Антыгероі першага рэпартажу ў якасьці пакараньня паехалі на экскурсію ў адно маленькае і ўтульнае каралеўства пад сьцягам аднаго фэадальнага саюза. Цяпер яны, мабыць, будуць пачынаць умацаваньне калгасаў не са свайго дому, а са сваёй дзялянкі цюльпанаў ці сваёй сыраварні.

■ На пяць рускіх пабольшала. Пяцёра мясцовых літаратараў былі днямі прынятыя ў саюз расейскіх пісьменьнікаў. Выдаўшы свае кніжкі па-расейску ў менскім выдавецтве „Тэхнапрынт”, яны адразу падалі заявы ў Маскву. Сёньня такіх у Беларусі ажно 16.

■ Пабольшала ня толькі „расейскіх” пісьменьнікаў. Створанае беларускае аддзяленьне Акадэміі ваенных навук Расейскай Фэдэрацыі ў Менску. Няцяжка здагадацца, што на наступных этапах „пакрокавай стратэгіі” беларускае войска мае стаць філіялам расейскай арміі.

■ Беларусь набывае расейскіх наёмнікаў. Толькі сёлета з нашым Міністэрствам абароны заключылі кантракт каля 200 былых вайскоўцаў расейскай арміі. Палкоўнік **А**. **Цапота** з упраўленьня кадраў Мінабароны пасьпяшаўся дадаць да інфармацыі, што „паступленьню на службу, безумоўна, папярэднічае працэдура атрыманьня беларускага грамадзянства”. Забыўся палкоўнік яшчэ сказаць: „і выдача кватэраў у Беларусі”. Але не забыўся згадаць пра „высокі прафэсіяналізм” наёмнікаў, многія зь якіх удзельнічалі ў Чачэнскай вайне. „Ідзе нармальны працэс...” — закончыў свой сьпіч палкоўнік.

■ У сувязі з палітычным і эканамічным крызісам пасьля распаду савецкай імпэрыі, з 1991 па 1994 гг. працягласьць жыцьця мужчын у Расеі зьнізілася на **6,3** гады, у Латвіі на **5** гадоў, на Ўкраіне на **4,1** года, у Летуве і Эстоніі на **2,8** года, у Беларусі на **2,8** года. У жанчын гэтыя паказчыкі былі: у Беларусі — на **1,3** года, у Расеі на **3,2** года. Але ў 1995 г. гэтая тэндэнцыя спыняецца ва ўсіх названых краінах, пачынаецца павелічэньне працягласьці жыцьця, нават у Расеі. І толькі ў Беларусі працягваецца зьніжэньне працягласьці жыцьця дагэтуль.



Фота Я. Даўгiловiча

*Шэсьце да месца спачынку Ларысы Геніюш (Зэльва, 11 жніўня 2002 г.)*

■ Лідэры „аб’яднанай” намэнклятурнай псэўдаапазыцыі ўзбагацілі палітычную думку нашай краіны сьвежымі ідэямі. На старонках „Народнай Волі” паведамлена тлустымі літарамі: „Юрый Хадыка рыхтуецца да абароны суверэнітэту Беларусі”. Сп. Хадыка сэнтымэнтальна ўспамінае, як „калісьці браў удзел у круглым стале ў Маскве, дзе абмяркоўваліся *пэрспэктывы беларуска-расейскай інтэграцыі”*. Во як!

Аказываецца, ні адзін Лукашэнка з „вертыкальлю” інтэграваў нашую краіну. Цікава было б даведацца, якіх дакумантаў нападпісваў тады сп. Хадыка ў белакаменнай?

Побач на газэтным полі — наступны шэдэўр „магутнага інтэлектуала” А. Лябедзькі (ён жа Лебедько) пад тытулам „Мы хотим предложить обществу правый взгляд на белорусско-российские отношения”. Займальная, як заўсёды, чытанка. Вось фрагмэнты: „Расея была, ёсьць і будзе фактарам адчувальнага ўплыву на разьвіцьцё сытуацыі ў Беларусі. Разуменьне гэтага вызначае прыярытэты нашых міжнародных кантактаў... Інтэграцыя стала сінонімам слова **аб’яднаньне**. Мы маем намер зламаць стэрыятыпы і разьвеяць міфы. Крэмль будзе спрыяць развязваньню беларускага вузла праблемаў і можа яшчэ больш умацаваць сваё становішча на Захадзе. Такім чынам, пазытыўнае ўзьдзеяньне Расеі на афіцыйны Менск *(чытаючы гэта, хочацца плакаць ад замілаваньня)* палітычна і эканамічна матываванае. Масква будзе душыць Лукашэнку ў абдымках.” Як пісалі некалі савецкія газэты, — „бурныя воплескі і крыкі „брава!”.

Неяк гарманічна паклаўся ў тым жа нумары газэты матэр’ял пад тытулам „Прастытутак стала больш”. Пра „пазытыўнае ўздзеяньне Расеі” сьведчыць статыстыка. Паводле зьвестак расейскай міліцыі, у 2000 г. толькі ў Маскве за заняткі прастытуцыяй да адміністрацыйнай адказнасьці былі прыцягнутыя 260 беларускіх грамадзянак, за 10 месяцаў сёлета — ужо 370. У Беларусі назіраецца тэндэнцыя росту колькасьці такіх злачынстваў, як зводніцтва, утрыманьне прытонаў, суценёрства. Групы беларускіх жанчынаў арганізавана ці самастойна выязджаюць для заняцьця прастытуцыяй у асноўным у Расею.

■ Неяк дзіўна было пачуць на паседжаньнях лукашэнкаўскіх „палатак” такія прызнаньні: „Пачаўся працэс дэпапуляцыі... устойлівае зьніжэньне нараджальнасьці, рост сьмяротнасьці і захворваньняў. На працягу апошніх сямі гадоў колькасьць насельніцтва краіны скарацілася амаль на 300 тысячаў чалавек, або на 2,9 %”. Так званы „нацыянальны сход” абмяркоўваў праблему „дэмаграфічнай бясьпекі” (а тэрмін які прыдумалі!) нашай краіны. Галоўны акушэр-гінэколяг Уладзімер Сілява заявіў палатнікам, што сёньня нараджальнасьць ў Беларусі ніжэй, чым падчас Другой Сусьветнай вайны (!). Нагадаў ім, што дапамога на дзіця складае толькі пяць адсоткаў мінімальнага пражытачнага ўзроўню. Палатнікі ў выніку абмеркаваньня парэкамендавалі Савету міністраў сярод іншага „искоренить вредные для здоровья привычки” і „павялічыць працягласьць жыцьця”.

Будзем спадзявацца, што міністры іх паслухаюцца і будуць жыць доўга.

■ Знаёмства з праектам дзяржаўнага бюджэту на 2002 г. — цікавы занятак. Так можна даведацца, што з грошай падаткаплацельшчыкаў выдзяляецца 2 мільярды 602 мільёны рублёў „Беларускаму патрыятычнаму саюзу моладзі”, сумнавядомаму лукамолу.

■ Раней прызнаньне прадпрыемства ў судовым парадку банкрутам лічылася на Магілёўшчыне сэнсацыяй. Цяпер гэта звычайная, штодзённая справа. Летась у рэгіёне банкрутамі прызнаныя 23 суб’екты гаспадараньня, сёлета — 10, і яшчэ з паўсотні такіх справаў знаходзіцца ў вытворчасьці Магілёўскага абласнога гаспадарчага суду. Апошняя справа, што паступіла ў Гаспадарчы суд, тычыцца Магілёўскага машынабудаўнічага заводу. Матывацыя — вялікія запазычанасьці, амаль паўмільярда рублёў.

Так рыхтуецца пляцоўка для расейскага крымінальнага капіталу.

## *СЬНЕЖАНЬ* (2001 г.)

■ Лідэрам у СНД па тэмпах прамысловага росту за 9 месяцаў 2001 г. стала Ўкраіна з **16,6** адсоткамі, на другім месцы — Таджыкістан (з **16%**), далей ідуць Казахстан (**13,8%**), Малдова (**12,2%**), Кыргыстан (**7,1%**), Азэрбайджан (**5,4%**), Расея (**5,2%**). Беларусь займае апошняе месца з **4,6%**.

■ За 10 месяцаў сёлета ў Беларусі зарэгістравана **92830** злачынстваў (у сярэднім, па 305 злачынстваў у дзень). На 10 тысячаў жыхароў зарэгістравана **93** злачынствы. Найбольшыя паказчыкі зафіксаваныя ў Гомельскай і Магілёўскай вобласьцях (па **112**), Менску (**100**) і Віцебскай вобласьці (**96**). 7,4 тысячы злачынстваў былі ўчыненыя ў грамадзкіх месцах. Раскрыцьцё злачынстваў у студзені-кастрычніку 2001 г. склала 62,1% супраць 69,2% у аналягічны пэрыяд 2000 г.

***Валеры БУЙВАЛ***

Беларускія Ведамасьці
Беларускае выданьне
У супрацоўніцтве зь Беларускім Выдавецкім Таварыствам ў Амэрыцы
**Рэдакцыя: Зянон Пазьняк, Галіна Палачаніна**
**Адрас рэдакцыі: 02-017 Warszawa, Al. Jerozolimskie 125/127**
**тэл./факс: (+48 22) 628 76 73**